153. МОСКВА 19.
УЛ. ФРУНЗЕ 19 ИНСТИТУТ
СОВ. СТРОИТЕЛЬСТВА
И ПРАВА
1. 1.12.36

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 125 (5499)
СЕРАДА
3
ЧЭРВЕНЯ
1936 г.
Год выдення XIX

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

У ЦВК І СНК САЮЗА ССР.

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — РАЗГОРНЕМ СПАБОРНІЦТВА ЦАГЕЛЬНІКАЎ. ПРАФЕСАРЫ **Н. ДАРОЖКІН, Г. ПРАТАСЕНЯ** — ДОГЛЯД БУЛЬБЫ ПАСЛЯ ПАСАДКІ. **С. ГАЛКІН** — ПАСЛЯ ЗАНЯТКАЎ.

ВОПЫТ УНУТРЫПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ Ў МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б. АБМЕН ВОПЫТАМ З ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ.

ЗАПРАШЭННЕ СОВЕЦКАГА ЎРАДА НА КАНФЕРЭНЦЫЮ Ў МОНТРЭ.

СССР-НА МІЖНАРОДНАЙ ПАРЫЖСКАЙ ВЫСТАЎЦЫ.

ПАСТАНОВА ЎПАЎНАВАЖАНАГА КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СНК СССР ПА БССР.

ЗА РУБЕЖОМ — ВЫПРАБАВАНЫ МЕТАД ПРАВАКАЦЫІ. АДКРЫЛАСЯ ФРАНЦУЗСКАЯ ПАЛАТА ДЭПУТАТАЎ.

РАЗГОРНЕМ СПАБОРНІЦТВА ЦАГЕЛЬНІКАЎ

ЦК КП(б)Б і Соўнарком БССР узяляюць выключна вялікую ўвагу рабоце цагельнай прамысловасці. За работай цагельных заводаў з напружанай увагай сочыць уся грамадскасць. Гэта і зразумела. У нас будуецца рад важнейшых аб'ектаў, якія маюць выключна вялікае дзяржаўнае значэнне. Яны патрабуюць шмат цаглы, і мы маем усё неабходнае, каб лапь гэтым пабудовам патрабную колькасць высокаякаснай цаглы.

Аднак з пачатку сезона цагельная прамысловасць працуе выключна дрэнна. З месяца ў месяц зрываюцца планы. Запазычанасць заводаў дзяржаве дасягае 30 мільёнаў штук цаглы. Будоўлі ўжо адчуваюць разультаты дрэннай работы цагельных заводаў. Адсутнасць цаглы затрымлівае тэмпы работы, пагражае зрывам будаўнічых графікаў.

21 мая было апублікавана рашэнне Соўнаркома БССР і ЦК КП(б)Б аб рабоце цагельнай прамысловасці. Праведзен рад эпаратыўных мерапрыемстваў, накіраваных на паляпшэнне работы заводаў. Па буйнейшых гарадах распублікі вылучаны ўпаўнаважаныя ЦК КП(б)Б і Соўнаркома. Сельскім раёнам прапанавана аказаць дапамогу заводам у вярбоўцы рабочай сілы.

У разультаце за апошнія 2 пяцідзесяткі мая ў выпуску цаглы-сырцу намеціўся некаторы, праўда, вельмі нязначны пералом. Асобныя заводы выканалі і нават перавыканалі майскую праграму.

Але наогул цагельная прамысловасць усё яшчэ працуе недапушчальна дрэнна, зрываюцца планы і выпуску сырцу і асабліва абпальвання. Раней дырэктары прадпрыемстваў прабавалі ўсю віну валіць на надвор'е. «Дрэннае надвор'е не дае нам разгарнуцца як след», — гаварылі яны. Але вось у маі было спрыяючае надвор'е. Не было дажджоў. Сушка была выключная. Чаму-ж сарваны план, чаму-ж так ганебна працавалі заводы?

Варта бліжэй прыгледзецца да работы асобных заводаў, і мы знаходзім адказ на гэта пытанне.

Дзе, у якой галіне прамысловасці так дрэнна разгорнут стаханаўскі рух, як у цагельнікаў? Дзе так дрэнна арганізован вытворчы працэс, як на цагельных заводах?

Ці-ж можна бюракратычным папяровым кіраўніцтвам з габінетаў забяспечыць нармальную работу завода? А іменна, паперкамі кіруе напрыклад, дырэктар завода № 13 **Малярэвіч**. Нядаўна гэты гора-дырэктар разаслаў начальнікам прасаў такія паперкі: ...«за дзве дэкады мая вамі не выканана (дзве лічба) цаглы. З улікам недавыканання красавіцкага плана вы павінны даць (лічба) цаглы ў апошнюю дэкаду мая. Прапаную прыняць усе захады, каб забяспечыць дзнае заданне. Дырэктар завода Малярэвіч. Тэхнарук Камянковіч».

Што можна сказаць аб такім дырэктару, які ў напружаны час сядзіць у сваім габінеце і адтуль «кіруе» паперкамі. Нікуды не варты такі дырэктар. Гэта не большэвіцкі арганізатар, які адчувае адказнасць за даручаную яму работу. Не дзіўна, што **завод № 13** працуе горш за іншыя адстаючыя заводы.

Такімі-ж метадамі кіруюць і на другіх заводах. Узяць, к прыкладу, **магілеўскі завод № 7.** Ён выканаў майскую праграму на сырцу на 90,7 проц., а па абпальванню—на 65,8 проц. Тут таксама няправільна расстаўлена рабочая сіла, ігнаруюцца рацыяналізатарскія прапановы рабочых, няма аператыўнага кіраўніцтва ўсімі ўчасткамі завода.

Яшчэ горш працуюць заводы райвыканкомаў і горсоветаў. Заводы **полацкага горсовета** выканалі сваю праграму па сырцу на 49,8 проц. і на 46,9 проц. Лічбы гэтыя самі гавораць аб здольнасцях кіраўнікоў гэтых заводаў і аб той увазе, якая аддаецца заводам полацкімі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі.

Вышэй мы ўжо ўказалі, што за апошнія пяцідзесяткі мая некаторыя заводы значна пайшлі наперад. У прыватнасці, трэба адзначыць добрую работу тав. **Пухавіцкага** — дырэктара **завода № 3** у Гомелі. Завод перавыканаў майскую праграму па сырцу і выканаў план па абпальванню. Добра працаваў **завод № 8** у Менску.

29 мая на радыёпераклічцы цагельных заводаў, якая была праведзена промаддзелам ЦК КП(б)Б і Наркаммясцпромам, дырэктары перадавых заводаў расказалі, як яны лабіліся перавыкананння плана. **Галоўнае — гэта шырокае разгортванне і арганізацыя стаханаўскага руху.** Кіраўнікі перадавых заводаў моцна ўзяліся за гэтае асноўнае звяно — за вырошчванне стаханаўцаў, прычым галоўная ўвага накіроўваецца на асноўныя рашаючыя цэхі. На заводзе № 3 у цэхах выходзяць насценныя газеты. Тут кладуцца аб людзях, тут няма месца голаму адміністраванню, бюракратычным метадам кіраўніцтва. Гэта і забяспечыла перамогу. На заводзе № 8 зарадзілася і была падхоплена назвычай каштоўная ініцыятыва пераводу абпальвання ў гофманскіх печах на два агні. Пры ўмове, калі ў нас, як правіла, абпальванне намнога адстае ад выпуску сырцу, гэта мерапрыемства набывае выключна вялікае значэнне. Яно павінна быць праведзена на ўсіх цагельных заводах.

Задача арганізацыі і ўсямернага разгортвання стаханаўскага руху на цагельных заводах стаіць востра. Тут **асабліва нецярпіма хоць малейшае праяўленне самацёку.** Гэта павінны, нарэшце, зразумець дырэктары заводаў, партыйныя, профсаюзныя арганізацыі.

Кадры стаханаўцаў на цагельных заводах ужо ёсць. Ім патрэбна ўсяляк дапамагчы, падтрымліваць іх ініцыятыву і, галоўнае, на іх вопыце трэба вучыць і выхоўваць новыя сотні і тысячы стаханаўцаў-цагельнікаў.

У гэтай сувязі надзвычай каштоўна ініцыятыва стаханаўцаў цэха абпальвання гомельскага завода № 3. Іх пісьмо было ўчора надрукавана ў «Звездзе». Яны прапануюць разгарнуць спаборніцтва цагельных заводаў Беларусі на лепшую сустрэчу свята 11 ліпеня — гадавіны вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Цэнтральнай задачай спаборніцтва ставіцца выкананне задання тав. **Гікало — даць пяцьсот мільёнаў штук цаглы.**

Гэта спаборніцтва павінны ўзначаліць, арганізаваць дырэктары заводаў, партыйныя і профсаюзныя арганізацыі. Гэта спаборніцтва, якое ахопіць шырокія масы цагельнікаў і дасць магутнае развіццё стаханаўскага руху, павінна пакласці канец ганебнаму адставанню цагельных заводаў.

Пара кіраўнікам цагельных заводаў паказаць узоры большэвіцкага кіраўніцтва! Пара ўзяцца за справу так, як гэтага патрабуе партыя!

АБ НЯПРАВІЛЬНЫМ ЗВАЛЬНЕННІ З РАБОТЫ ТАВ. МАРЧАНКА Е. П.

ПАСТАНОВА ЎПАЎНАВАЖАНАГА КАМІСІІ СОВЕЦКАГА КАНТРОЛЯ ПРЫ СНК СССР ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Народны суддзя Брагінскага раёна БССР Афанас'еў П. С. заведама няправільна, пад выглядам непрыгоднасці да работы, зволіў справавода суда Марчанка Е. П., добрасумленнага работніка, якая ўказвала на недахопы ў рабоце названага суда.

Не глядзячы на судовыя рашэнні аб неадкладным аднаўленні Марчанка на рабоце і неаднаразовыя прадпісанні пракуратуры і Вярхоўнага суда БССР, суддзя Афанас'еў у працягу года не прадастаўляў т. Марчанка работы. Гэтыя дзеянні Афанас'ева над работнікам не былі ў праверкі КСК спынены ў выніку таго, што Вярхоўны суд БССР (былы намеснік старшыні т. Абрамаў), куды тав. Марчанка абскардзіла дзеянне Афанас'ева, аднёсся да яе скарг бюракратычна і, абмежаваўшыся фармальнымі прапісаннямі Афанас'еву, не забяспечыў фактычнага аднаўлення тав. Марчанка на рабоце.

1. Народнага суддзю Брагінскага раёна БССР Афанас'ева П. С. за заведама няправільнае звальненне добрасумленнага работніка і невыкананне суловых рашэнняў аб яго аднаўленні на рабоце — з пасады народнага суддзі зняць і прыцягнуць да крымінальнай адказнасці.

2. За фармальныя адносіны да скаргі т. Марчанка і непрыняцце мер да спынення адміністрацыйнага сваволля з боку яе кіраўніка — былому намесніку старшыні Вярхоўнага суда БССР т. Абрамаву абвясціць вымову.

3. Прапанаваць старшыні Вярхоўнага суда БССР т. Кудзельскаму, у адпаведнасці з маючымся рашэннем суда, неадкладна аднавіць супрацоўніцу брагінскага народнага суда т. Марчанка на рабоце ў тым-жа судзе.

Растлумачыць т. Кудзельскаму, што пры разборы скарг працоўных неабходна не толькі вынясенне рашэння па скарзе, але і кантроль за сапраўдным аднаўленнем парушаных правоў працоўнага.

Упаўнаважаны КСК пры СНК СССР па беларускай ССР
А. ЦІХОН.

ПРАМЫЯ ВАГОНЫ МЕНСК — СЕВАСТОПАЛЬ І МЕНСК — ЕЎПАТОРЫЯ

З сёнешняга дня з поездам № 96 Менск — Харкаў, які адпраўляецца ў 13 гадзін 30 минут, пачынаюць штодзенна курсаваць прамыя бесперасадачныя плацкартныя вагоны Менск — Севастопаль і Менск — Еўпаторыя.

Запрашэнне совецкага ўрада на канферэнцыю ў Монтрэ

На імя народнага камісара па замежных справах тав. Літвінава паступіла тэлеграма ад міністра замежных спраў Турцыі п. Тэфік Рюшцю Арас, які паведамляе, што канферэнцыя па пытанню аб рэжыме праліваў адбудзецца 22 чэрвеня 1936 года ў гор. Монтрэ і просіць урад Саюза ССР прыслаць к гэтаму тэрміну сваіх прадстаўнікоў на канферэнцыю.

У адказнай тэлеграме намеснік народнага камісара па замежных справах т. Н. Н. Крэсцінскі паведаміў п. Арас, што Ўрад Саюза ССР будзе прадстаўлен на канферэнцыі ў Монтрэ народным камісарам па замежных справах тав. М. М. Літвінавым.

ГАНДЛЕВЫ ДАГАВОР ПАМІЖ ГЕРМАНІЯЙ І МАНЧЖОУ-ГО

ТОКІО, 1 чэрвеня (БЕЛТА). Сёння ў японскіх газетах апублікована ганлёвае пагадненне, заключанае 30 красавіка паміж Германіяй і Манчжоу-Го і ўступаючае ў сілу з 1 чэрвеня.

Гэта пагадненне прадстаўляе Манчжоу-Го права ўвозіць у Германію на працягу года на 100 мільёнаў манчжурскіх долараў прадуктаў Манчжоу-Го. З гэтай сумы 75 млн. долараў будзе аплочана замежнай валютай, а астатнія — германскімі маркамі, з умовай, што германскія маркі будуць скарыстаны для закупак Манчжоу-Го ў Германіі.

Разам з тым Германіі прадастаўляецца права ў выпадку недахопу замежнай валюты скараціць штогодні імпарт з Манчжоу-Го да 65 млн. долараў, захоўваючы тыя-ж суадносіны замежнай валюты і германскай маркі.

ВЫПРАБАВАНЫ МЕТАД ПРАВАКАЦЫІ

ПРАДЛОГ ДЛЯ НОВАГА НАСТУПЛЕННЯ ЯПОНСКІХ ВОЙСК

БЕЙПІН, 1 чэрвеня (БЕЛТА). У мясцовых колах указваюць, што «цяньцзінскі інцыдэнт» (узрыў бомбы на ўчастку чыгункі) арганізован яшчэ больш нязграбна, чым нават узрыў каля Мукдэна (18 верасня 1931 г.) перад захватам Манчжурыі японцамі.

Як паведамляе газета «Пекін энд Цяньцзін таймс» спецыяльны вайсковы поезд спыніўся недалёка ад месца ўзрыву на 5 ці 10 минут раней узрыву.

Як-бы ў прадбачанні падзей, другі японскі вайсковы састаў, які па раскладу павінен быў выйсці з Тангу ў 10 гадзін, заставаўся ў Тангу ўсю ноч.

У сувязі з узрывам бомбы японцы ўжо прад'явілі пратэст цяньцзінскім уладам.

***

ЛОНДАН, 1 чэрвеня (БЕЛТА). Ва ўсіх апошніх паведамленнях, атрыманых з Паўночнага Кітая, падкрэсліваецца, што «загадачны» ўзрыў бомбы на чыгунцы Цяньцзінь—Бейпін можа прадвяшчаць новы захват японцамі кітайскай тэрыторыі.

У радакцыйным артыкуле газета «Н'юс кронікл» піша, што апошні ўзрыў бомбы назвычай напамінае той, які быў скарыстан як прадлог да захвату Манчжурыі ў 1931 годзе. Паводле слоў газеты апошні выпадак «адбыўся дзіўным чынам якраз у той момант, калі японцы закончылі папаўненне сваіх войск у Паўночным Кітаі» Для Японіі ўзрыў бомбы—звычайны сігнал для прасоўвання ўварваўшайся армії.

***

БЕЙПІН, 1 чэрвеня (БЕЛТА). 30 мая прыбылі новыя японскія войскі. Чыгуначная станцыя горада Бейпіна была падобна на ваенны лагер. Перад прыбыццём вайсковага састава японскія салдаты занялі станцыю і выставілі кулямёты ва ўсіх стратэгічных пунктах. З станцыі былі удалены нават іншаземцы.

Большасць новапрыбыўшых салдат паслана прама ў горад Тунчжоу (сталіца дзяржавы Інь Жу-гена каля Бейпіна).

На вузлавой станцыі Фынтай вядуцца ўмоцненыя работы па пабудове новых казарм, аэрадрома і новай тэлефоннай лініі.

Міжнародная хроніка

* Гадавая канферэнцыя аб'яднанага профсаюза паравозных машыністаў і качагараў Англіі прыняла 47 галасамі супроць чатырох рэзалюцыю, якая **падтрымлівае прапанову компартыі Англіі** аб уступленні яе ў лейбарыстскую партыю на правах самастойнай арганізацыі.

* Бухарэсцкая газета «Адэверул» паведамляе **аб сялянскіх хваляваннях** у раёне Мехедыцы (паўднёва-заходняя Румынія). Сяляне разграмілі аддаленне народнага банка. У сувязі з хваляваннямі жандармерыя правяла арышты сярод сялян.

* Як паведамляе газета «Кур'ер поранны» на працягу красавіка ў Польшчы праведзена **48 працэсаў супроць асоб, абвінавачаных у камуністычнай дзейнасці.** 271 абвінавачваемы прыгаворан увогуле да 964 год турэмнага зняволення.

* Румынскі кароль паслаў міністра замежных спраў **Тытулеску** ў Белград, каб высветліць сапраўднае значэнне паездкі польскага міністра замежных спраў Бека ў Югаславію. Падазраюць, што Бек ставіў сваёй мэтай пабудзіць Югаславію далучыцца да германа-польскага саюза, накіраванага супроць СССР.

* Італьянскі совет міністраў прыняў закон аб **адміністрацыйным кіраванні ў італьянскай Усходняй Афрыцы** (Абісінія, Эрытрэя, Самалі). Згодна закона італьянская Усходняя Афрыка падзяляецца на 5 губерань і падначальваецца віцэ-каралю. Пры віцэ-каралі будзе працаваць урадавы совет з вышэйшых чыноўнікаў і генеральны совет у складзе 5 італьянцаў і 5 туземных правадыроў.

* Па распараджэнню італьянскіх улад **забаронен імпарт у Абісінію** прадуктаў з тых краін, якія ўжываюць эканамічныя санкцыі супроць Італіі.

* 53 дзяцей нарадзілося на вуліцах Будапешта (Венгрыя) на працягу двух тыдняў. Маткі гэтых дзяцей — беспрацоўныя, якія не маюць прытулку.

* 31 мая ў Прагу (Чэхаславакія) прыбыла **харавая капела** ўсесаюзнага радыёкамітэта пад кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі Свешнікава. На вакзале капелу сустракалі прадстаўнікі пражскага муніцыпалітэта, рабочага харавога таварыства, таварыства культурнай сувязі з СССР, члены совецкай калоніі, шматлікія прадстаўнікі работнікаў мастацтва.

АДКРЫЛАСЯ СЕСІЯ ПАЛАТЫ ДЭПУТАТАЎ

ПАРЫЖ, 1 чэрвеня (БЕЛТА). Адкрылася палата дэпутатаў (французскі парламент новага склікання) Зал пасяджэння пачаў запаўняцца яшчэ задоўга да адкрыцця пасяджэння. Камуністычная фракцыя заняла ўвесь крайне левы сектар палаты, адсунуўшы некалькі ўправа сацыялістаў і радыкалаў. Апошнія апынуліся ў самым цэнтры амфітэатра палаты.

Першае пасяджэнне насіла чыста фармальны характар і цягнулася не больш 20 минут. Пасяджэнне адкрыў старэйшы па ўзросту дэпутат Саллес (член «рэспубліканска-сацыяльнай» групы). Саллес адкрыўшы новую палату, выступіў з траляцыйнай прамовай, у якой гаварыў аб імкненні французаў жыць у згодзе са сваімі суседзямі і аб неабходнасці нацыянальнага яднання для ажыццяўлення гэтай мэты.

***

ПАРЫЖ, 1 чэрвеня (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, Эрыо заявіў, што ён не пярэчыць супроць выстаўлення яго кандыдатуры на пост старшыні палаты дэпутатаў.

«МІР НЯМЫСЛІМЫ БЕЗ УДЗЕЛУ СОВЕЦКАГА САЮЗА»

ВЫСТУПЛЕННІ Ў ЧЭХАСЛАВАЦКІМ СЕНАЦЕ

ПРАГА, 29 мая (БЕЛТА). Камісія па замежных справах чэхаславацкага сената адобрыла выступленне міністра замежных спраў Крофты. Амаль усе выступаўшыя ў спрэчках аратары, закранаючы адносіны Чэхаславакіі з СССР, падкрасліваліі **выдатнае значэнне супрацоўніцтва з Совецкім Саюзам.**

Прадстаўнік чэшскай народнай партыі (каталіцкай) сенатар Рышар заявіў: **«Без удзелу Совецкага Саюза ўсеагульны мір немыслімы. Еўропа больш не можа абыходзіцца без супрацоўніцтва Совецкага Саюза».**

Міністр замежных спраў Крофта ў заключным слове канстатаваў, што і на пытанню аб адносінах да Совецкага Саюза сярод дзяржаў Малой Антанты ёсць поўная аднадушнасць.

ХВАЛЯВАННІ Ў ПАЛЕСТЫНЕ

ЛОНДАН, 1 чэрвеня. (БЕЛТА). Паведамленні з Палестыны гавораць аб тым, што становішча там па-ранейшаму напружанае.

З сёнешняга дня аб'яўлена забастоўка арабскіх муніцыпальных рабочых у Яффе, Наблусе, Рамле, Ліддзе і Геброне. Улады апасаюцца што калі да забастоўкі далучацца муніцыпальныя рабочыя іншых гарадоў, то іх прыкладу паследуюць дзяржаўныя служачыя-арабы.

Арабы-докеры ў Яффе згатаўляюць бомбы і закідваюць імі паліцэйскія пасты. Учора ў Тэль-Авіве згарэў лясны склад. Калі прыбыла для тушэння пажару пажарная брыгада, у яе былі кінуты бомбы.

***

ДОЎДАН, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Учора недалёка ад Тэль-Авіва арабы абстралялі 2 аўтобусы. Адзін пасажыр забіт, 2 ранены. Муніцыпальныя рабочыя ў Акры і Еніне далучыліся да забастоўкі. Чакаюць, што забастоўка муніцыпальных рабочых пашырыцца на іншыя арабскія гарады.

Згодна вестак газеты «Дэйлі тэлеграф», англійскія ўзброеныя сілы ў Палестыне будуць павялічаны адным батальёнам бедфордшырскага палка, які адпраўляецца ў Палестыну з Егіпта. Усяго ў Палестыне будзе знаходзіцца 5 англійскіх пехотных батальёнаў.

Знатны тарфянік торфзавода «Шлях соцыялізма» (БССР) Андрэй Пятровіч Курэнеў вылучан на пасаду намесніка начальніка агрэгата першай элеватарнай машыны. Фота Сарокіна.

У ЦВК І СНК Саюза ССР

27 мая г. г. ЦВК і СНК Саюза ССР зацвердзілі новае палажэнне аб Народным камісарыяце фінансаў СССР.

Згодна гэтаму палажэнню на Народны камісарыят фінансаў Саюза ССР ускладаецца правядзенне ўстаноўленай урадам Саюза ССР фінансавай палітыкі і кіраўніцтва ўсёй фінансавай справай Саюза ССР.

На чале Народнага камісарыята фінансаў Саюза ССР стаіць народны камісар, які мае трох намеснікаў, у тым ліку кіраўнік Дзяржаўнага банкам (па пасадзе).

У складзе народнага камісарыята фінансаў Саюза ССР утвараюцца наступныя кіраўніцтвы і аддзелы: 1) Бюджэтнае кіраўніцтва; 2) Кіраўніцтва дзяржаўных прыбыткаў; 3) Кіраўніцтва пазыкаў і збораў з насельніцтва; 4) Штатнае кіраўніцтва; 5) Аддзел фінансавання цяжкой і лясной прамысловасці; 6) Аддзел фінансавання лёгкай, харчовай і мясцовай прамысловасці; 7) Аддзел фінансавання сельскай гаспадаркі; 8) Аддзел фінансавання транспарта і сувязі; 9) Аддзел фінансавання комунальнай гаспадаркі; 10) Аддзел фінансавання ўнутранога гандлю і загатовак; 11) Аддзел фінансавання культурных мерапрыемстваў; 12) Валютны аддзел; 13) Аддзел фінансавання абароны; 14) Кіраўніцтва фінансавымі навучальнымі ўстановамі; 15) Адміністрацыйна-гаспадарчы аддзел; 16) Сектар прадпрыемстваў Наркамфіна СССР: 17) Сакратарыят. Апрача таго непасрэдна пры народным камісары састаяць група па праверцы выкананння і сектар па ўліку і падбору кіруючых фінансавых кадраў.

Пры Народным камісарыяце фінансаў Саюза ССР састаіць Цэнтральная камісія па штатах, правы і абавязкі якой устаноўлены асобным законам.

Народнаму камісарыяту фінансаў падначалены наступныя органы, дзейнічаючыя на аснове асобных палажэнняў і статутаў: Галоўнае кіраўніцтва дзяржаўных прапоўных ашчадных кас і дзяржаўнага крадыту; Галоўнае кіраўніцтва дзяржаўнага страхавання; банк фінансавання капітальнага будаўніцтва прамысловасці, транспарта і сувязі (Промбанк), Сельскагаспадарчы банк (Сельгасбанк); Цэнтральны банк фінансавання комунальнай гаспадаркі і жыллёвага будаўніцтва (Цэкомбанк); банк фінансавання капітальнага будаўніцтва гандлю і кааперацыі (Гандльбанк); фабрыка «Госзнак»; Манетны двор; Дзяржаўнае фінансавае выдавецтва; Газета «Экономическая жизнь»; навукова-даследчы фінансавы інстытут.

Пры Народным камісары фінансаў Саюза ССР састаіць Совет народнага камісара, склікаемы раз у два месяцы.

СССР—на міжнароднай парыжскай выстаўцы

МАСКВА, 2 чэрвеня. (БЕЛТА). Як паведамлялася ў свой час Соўнарком СССР прыняў запрашэнне Францыі прыняць удзел у міжнароднай парыжскай выстаўцы «Мастацтва і тэхніка ў сучасным жыцці», якая намечана к адкрыццю ў маі 1937 года.

Выстаўка павінна паказаць неразрыўную сувязь тэхнікі і розных відаў мастацтва ў сучасным жыцці.

У сучасны момант запрашэнне ўдзельнічаць на выстаўцы прынялі, апрача СССР, яшчэ 42 краіны.

Соўнарком СССР зацвердзіў асноўныя палажэнні праграмы совецкага аддзелу на парыжскай выстаўцы. Паколькі яна супадае з 20-годдзем Кастрычніцкай рэволюцыі, павільён СССР прадэманструе дасягненні совецкай улады за гэты перыяд.

Павільён СССР будзе размешчан на галоўнай магістралі парыжскай выстаўкі: Трокадэро — Эйфелева вежа, на беразе Сены, паміж двума радамі высокіх платанаў. На ўчастку ў 6.500 кв. мётраў будуць пабудаваны павільён СССР і, акрамя таго, асобны кіно-тэатр для дэманстрацыі лепшых дасягненняў совецкай кінематаграфіі і эстрада для лепшых мастацкіх ансамбляў.

Праект павільёна СССР на міжнароднай парыжскай выстаўцы ўжо зацверджан Соўнаркомам СССР. Прынят праект распрацаваны архітэктарам Б. М. Іофанам.

ПАВЕТРАНЫ РЭЙС МАСКВА—ВЛАДЗІВАСТОК

МАСКВА, 2 чэрвеня (БЕЛТА) 1 чэрвеня з маскоўскага аэрапорта падняўся паштова-пасажырскі самалёт, пілатуемы адным з лепшых лётчыкаў авіафлота тав. Герасімавым, і, зрабіўшы круг над аэрадромам, адправіўся ў першы летні скразны рэйс па найвялікшай у свеце паветранай трассе Масква—Владзівасток. Даўжыня гэтай лініі перавышае 8 тыс. клм. Самалёт пакрыў адлегласць загружан авіяпоштай і апошнімі нумарамі маскоўскіх газет.

Ва Владзівастоку самалёт будзе на 4-ты дзень у 8 гадзін 20 м. раніцы.

ПА КРАІНЕ СОВЕТАЎ

* Усе дзіцячыя тэатры — тэатры юнага глядача, лялечныя тэатры і іншыя тэатры для дзяцей па ўсяму Саюзу пераходзяць у веданне органаў камітэта па справах мастацтваў. Непасрэдна кіраваць усімі відовішчнымі прадпрыемствамі для дзяцей будуць кіраўніцтвы тэатраў пры ўсесаюзным камітэце і тэатральныя аддзелы пры мясцовых камітэтах па справах мастацтваў.

* Народны камісарыят воднага транспарту дазволіў адкрыць папярэдні продаж пасажырскіх білетаў на параходы, апрача Масквы, Ленінграда і Кіева, яшчэ ў 17 гарадах, у тым ліку ў Гомелі.

* Недалёка ад Тагіла (Урал) паміж сёламі Вялікая Лая і Малая Лая геалагічная партыя выявіла новае багатае месцанараджэнне золата. Процант золата ў пародзе высокі. Золата залягае на глыбіні 12 мётраў.



Пасёлак гомельскага шклозавода імя Сталіна ператвараецца ва ўзорны па чыстаце гарадок.
НА ЗДЫМКУ: від з тэрасы аднаго з дамоў завода на рабочы пасёлак. Фота С. Грына (Белсаюзфота).

ВОПЫТ УНУТРЫПАРТЫЙНАЙ РАБОТЫ У МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ КП(б)Б

ЗАМАЦАВАЦЬ РЭЗУЛЬТАТЫ

Друкуемы сёння матэрыял брыгады гомельскага гаркома і артыкулы сакратароў гаркомаў тт. Рыскіна і Стакуна сведчаць аб надзвычайнай важнасці і каштоўнасці абмену вопытам работы, які праведзен менскім і гомельскім гаркомамі партыі.

Менская і гомельская брыгады знайшлі ў рабоце пярвічных партарганізацый, з якімі яны знаёміліся, многа дадатных і каштоўных момантаў, якія будуць перанесены імі ў свае партыйныя арганізацыі. Разам з тым і ў Менску, і ў Гомелі брыгады выкрылі нямала буйнейшых недахопаў і ўпушчэнняў.

Той факт, што матэрыялы брыгад, як паведамляюць сакратары гаркомаў, будуць абмяркоўвацца ў партыйных арганізацыях, сведчыць аб велізарнай дзейснасці большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, аб надзвычайнай важнасці для партарганізацый Гомеля і Менска тых элементаў спаборніцтва, якія ўнесены ў іх работу ўзаемнымі паездкамі брыгад і шырокім абменам вопытам.

Сёння мы друкуем матэрыял аб дадатным вопыце некаторых партарганізацый Менска. Тым больш неабходна падкрэсліць, што партыйная арганізацыя сталіцы, узняўшая сваю работу за час праверкі і абмену партыйных дакументаў, на сёпешні дзень усё яшчэ адстае і мае рад істотных недахопаў.

Арганізацыя ідзе да завяршэння абмену партдакументаў. Аднак, райкомы яшчэ вельмі марудна прымаюць меры для выпраўлення недахопаў партработы, выяўленых у час абмену.

За час праверкі і абмену гаркомам і райкомамі былі выяўлены сотні людзей, залічаных у рэзервы партыйнага актыва. Але сістэматычнай работы з рэзервамі райкомы не вядуць.

Райкомы яшчэ слаба звязаны з пярвічнымі арганізацыямі дробных прадпрыемстваў. Інструктары райкомаў бываюць толькі на буйных прадпрыемствах, а драбнейшых арганізацый не наведваюць. А якраз гэтым арганізацыям найбольш патрэбна дапамога.

З усёй сілай трэба падкрэсліць слабасць работы пярвічных арганізацый з рэзервамі партыі — слабае кіраўніцтва комсамолам і малую ўвагу групам спачуваючых.

Задача заключаецца ў тым, каб падцягнуць усе арганізацыі да ўзроўню перадавых, каб поўнасцю выправіць усе недахопы і ўпушчэнні, заўважаныя брыгадай Гомельскага гаркома партыі.

Партыйны арганізатар групы фабрыкі «Кастрычнік» тав. Бутылёў А. В., адзін з арганізатараў стаханаўскага руху на фабрыцы.

Прапагандыст раённай партыйнай школы Кагановіцкага райкома КП(б)Б тав. Кулікаў М. Ф.

Тав. Чэрнін І. А., стаханавец, папулярны агітатар менскай галантарэйнай фабрыкі імя Куйбышэва.

Тав. Сіўчык — адзін з лепшых партыйных арганізатараў, стаханавец кавальскага цэха машынабудаўнічага завода імя Кірава.

РЫСКІН
Сакратар Менскага гаркома КП(б)Б.

ПРАВІЛЬНАЯ КРЫТЫКА

Паездка групы партыйнага актыва Менска ў Гомель і гомельскіх таварышоў у Менск ператварылася ў надзвычай карысную і сур'ёзную справу. Гэты пачын дапаможа нам зрабіць вопыт лепшых партарганізацый абодвух гарадоў узаемным здабыткам і дасць нам магчымасць выправіць рад вялікіх і малых недахопаў.

Бясспрэчна, што праверка і абмен партыйных дакументаў азнаменаваліся ў менскай партарганізацыі, як і ва ўсёй ВКП(б), агульным уздымам партыйнай работы і партыйнага жыцця. Мы цяпер лепш ведаем людзей, больш працуем з кожным комуністам у паасобку, нам удалося выявіць значныя рэзервы новага партыйнага актыва, гарком і пярвічныя арганізацыі сталі больш ваймацца вучобай комуністаў.

Але ўсё гэта толькі першыя крокі. Мы яшчэ значна адстаем ад тых павышаных запатрабаванняў, якія прад'яўляюцца да нас, як сталічнай арганізацыі.

Мы яшчэ не навучыліся як след падыходзіць да кожнага асобнага комуніста, ведаць яго запатрабаванні, дапамагаць яму ў палітычным і агульнакультурным росце. Многія сакратары парткомаў, жадаючы ва што-б там ні стала ператварыцца ў «кіраўнікоў» сваіх арганізацый, забываюць што кіраваць — гэта ў першую чаргу ведаць людзей, вучыць іх, аказваць ім жывую і рэальную дапамогу. Элементы такога агульнага кіраўніцтва можна заўважыць нават з боку сакратароў парткомаў завода імя Кірава і фабрыкі «Кастрычнік», дзе партыйныя арганізацыі наогул працуюць нядрэнна.

Бясспрэчна, што ўся партарганізацыя ў цэлым і парткомы ў прыватнасці сталі больш займацца пытаннямі вучобы комуністаў. Але многія сакратары парткомаў яшчэ не навучыліся глыбока ўваходзіць у тэхніку такой складанай справы, як партыйная прапаганда.

Для таго, каб канкрэтна кіраваць вучобай комуністаў, трэба не толькі ведаць, што робіцца ў падручніках, але трэба ведаць, што такое канспект, трэба ведаць методыку партыйнай прапаганды. А для гэтага трэба, каб сакратары парткомаў самі былі прапагандыстамі, трэба, каб яны больш працавалі над пашырэннем свайго палітычнага і агульнакультурнага кругазору. Гэтага яшчэ нельга сказаць аб многіх сакратарах парткомаў, аб чым правільна ўказала нам брыгада.

Не можам мы пахваліцца і работай са спачуваючымі. Іх па Менску налічваецца толькі 800 чалавек, у той час, калі мы маем па гораду 8,000 стаханаўцаў. Вядомая справа, што пры адпаведнай рабоце з беспартыйным актывам, лік спачуваючых быў-бы значна большы. За гэты ўчастак работы нам прыдзецца ўзяцца сур'ёзна, каб па-большэвіцку падрыхтавацца да прыёму ў партыю.

Не зусім добра абстаіць яшчэ ў нас справа з вырошчваннем і замацаваннем кадраў партыйнага актыва. У многіх пярвічных арганізацыях па некалькі раз у год, нярэдка ў разрэз з элементарнымі патрабаваннямі ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, мяняюцца сакратары парткомаў і парторгі. Аб гэтым зусім правільна сігналізавала «Правда», і мы цяпер сур'ёзна працуем над тым, каб дабіцца ўстойлівасці партыйных кадраў.

Прыезд гомельскіх таварышоў, іх дзелавая і таварыская крытыка нашых недахопаў, той абмен вопытам, пачатак якому пакладзен нашымі сустрэчамі, павінны адыграць і адыграюць вялікую ролю ў паляпшэнні ўсёй работы нашай партарганізацыі. Вынікі работы брыгад мы ў бліжэйшыя дні абгаворым на бюро гаркома і на ўсёй партарганізацыі.

СЕМ ДЗЕН У ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ МЕНСКА

1. НОВЫ АКТЫЎ

У гэтым артыкуле мы хочам расказаць аб прыкладах работы менскай партыйнай арганізацыі, якія заслугоўваюць таго, каб перанесці іх у нашу арганізацыю. Калі мы знаёміліся з тым, як партыйныя арганізацыі замацоўваюць вынікі праверкі і абмену партыйных дакументаў, мы да менскай арганізацыі, як да сталічнай, падыхлі з асабліва высокімі патрабаваннямі. Улічылі мы і такі фактар, як стварэнне ў Менску трох раённых камітэтаў партыі, што з'яўляецца важнейшым арганізацыйным мерапрыемствам, праведзеным ЦК ВКП(б) а мэтай паляпшэння ўсёй партыйнай работы ў арганізацыі.

Што станоўчае ў рабоце тых пярвічных партарганізацый, з якімі мы пазнаёміліся? Самае галоўнае — гэта ўменне спалучаць абмен партыйных дакументаў з уздымам усёй партыйнай работы.

Партыйныя арганізацыі сур'ёзна працуюць над замацаваннем той актыўнасці членаў партыі, якую выклікалі праверка і абмен партыйных дакументаў. У кожнай пярвічнай арганізацыі пасля абмену партыйных дакументаў на партыйных сходах заслухоўвалі даклад члена бюро райкома, або сакратара парткома аб выніках абмену, аб недахопах асобных комуністаў і ўсёй партарганізацыі, і тут-жа рашалі, як гэтыя недахопы выправіць.

На сходзе партарганізацыі фабрыкі імя Кагановіча (сакратар парткома т. Гефен) замест пастановы аб выніках абмену, прынялі план работы партыйнай арганізацыі на май месяц. Увесь план выходзіць з вынікаў абмену. Тое-ж самае можна сказаць і аб партарганізацыях фабрык «Кастрычнік», імя Куйбышэва і інш.

Прадэманстраванем такіх партыйных сходаў пярвічныя арганізацыі перамаглі настрой самасупакаення, які назіраўся ў асобных таварышоў. Лепш сталі працаваць з кожным комуністам, узнялі актыўнасць і ініцыятыву членаў партыі.

Ёсць рад фактаў, калі пасіўныя і адсталыя ў мінулым члены партыі сталі перадавымі людзьмі на вытворчасці і актыўнымі ўдзельнікамі ў грамадскай рабоце. Тав. Персіц — работніцу фабрыкі імя Куйбышэва — у недалёкім мінулым лічылі «пасіўнай». Зараз, калі партком аказаў канкрэтную дапамогу, яна не толькі з'яўляецца лепшым слухачом партшколы, але, як актыўную і прыкладную комуністку, яе выбралі парторгам цэха і яна паспяхова спраўляецца з гэтай работай.

2. ВЫХАВАННЕ РЭЗЕРВАЎ

Кандыдат партыі тав. Будніцкі (рабочы той-жа фабрыкі) дрэнна працаваў над сабой, на вытворчасці сістэматычна даваў брак. Настойлівая работа і гутаркі з ім членаў парткома, уцягванне яго ў актыўнае партыйнае жыццё дапамагалі тав. Будніцкаму стаць стаханаўцам і выконваць план на 250 проц., добра вучыцца ў кандыдацкай школе, сістэматычна чытаць газеты і літаратуру.

Больш увагі сталі аддаваць партыйныя арганізацыі рабоце са спачуваючымі. Партыйны камітэт фабрыкі «Кастрычнік» на сваім пасяджэнні слухае спачуваючых аб іх палітычным росце і выкананні даных ім даручэнняў. Мы прысутнічалі на зменных партыйных сходах, прысвечаных гэтаму пытанню. Сходы прайшлі ажыўлена, і мы зрабілі вывад, што партыйныя арганізацыі вельмі сур'ёзна сталі адносіцца да гэтай работы, адчулі ўсю адказнасць, якая кладзецца на іх за работу са спачуваючымі.

У плане работы партарганізацыі фабрык імя Куйбышэва, «Кастрычнік», імя Кагановіча рабоце са спачуваючымі адведзена вялікае месца. Даволі сур'ёзную работу разгарнулі партбюро па ўзняцці ідэйнага ўзроўню спачуваючых. Тут прапрацоўваюць з імі асобныя артыкулы з журнала «Партийное строительство», знаёмяць іх з важнейшымі пытаннямі партыйнай работы.

Але ёсць і істотныя недахопы ў гэтай рабоце. Партком фабрыкі «Кастрычнік» амаль усю работу са спачуваючымі пераваліў на плечы зменных парторгаў, партгрупы, а сваю ролю, звёў да правядзення агульных нарад, сустрэч і т. д.

Што датычыць партыйнага кіраўніцтва комсамолам, то яно ў Менску зусім нездавальняючае. Комсамольцы зусім правільна скардзяцца на партарганізацыі. Сакратар камітэта комсамола фабрыкі «Кастрычнік» тав. Неменман нам заявіла, што ў апошні час партком зусім не кіруе комсамольскай арганізацыяй.

Тут, як і ва многіх іншых партарганізацыях, мабыць, не чыталі прамовы тав. Андрэева на X з'ездзе комсамола.

На фабрыцы «Кастрычнік» мы прысутнічалі на занятках па гісторыі партыі, якімі кіраваў прапагандыст Эвенчык. На заняткі ён прыйшоў зусім непадрыхтаваным, без канспекта. Сказаў некалькі слоў, потым даў слухачам чытаць 10 старонак з гісторыі грамадзянскай вайны, на гэтым заняткі і скончыліся. З гутаркі са слухачамі гэтага гуртка выявілася ўся мізэрнасць іх ведаў.

Партком фабрыкі «Кастрычнік» не зусім канкрэтна кіруе партыйнай прапагандай. Не было такога выпадку, каб партком заслухаў прапагандыстаў — як яны рыхтуюцца да заняткоў, як складаюць канспекты і ўсвойваюць матэрыял.

3. РАССТАНОЎКА ПАРТЫЙНЫХ СІЛ

Усе комуністы партарганізацыі завода імя Кірава, фабрык імя Кагановіча, імя Куйбышэва і раду іншых прадпрыемстваў з'яўляюцца стаханаўцамі, і ўзначальваюць стаханаўскі рух сярод беспартыйных рабочых. Мы асаблівую ўвагу звярнулі на работу партарганізацыі фабрыкі «Кастрычнік».

На фабрыцы «Кастрычнік» зараз больш 60 проц. рабочых стаханаўцы. Усе комуністы — стаханаўцы. Партарганізацыя фабрыкі знішчае ўсе перашкоды, якія тармозяць развіццё стаханаўскага руху, і дапамагае комуністам і беспартыйным рабочым стаць стаханаўцамі.

Партыйныя арганізацыі перастаўлялі многіх комуністаў з другарадных работ (розных абслугоўваючых пасад: загадчыкаў гаспадаркі, кладаўшчыкоў) непасрэдна да варштата. Паставілі іх на рашаючыя ўчасткі вытворчасці. Гэта мела вялікае значэнне ў павышэнні авангарднай ролі партыйных арганізацый на вытворчасці, у паляпшэнні і большай канкрэтызацыі партыйнага кіраўніцтва стаханаўскім рухам.

На фабрыцы імя Кагановіча з падсобнай работы да варштата пераставілі тт. Каца, Каждана, Дабравольскага, Пеўзнера і інш., усяго 21 чал. Вялікую перастаноўку зрабілі на заводзе імя Кірава. Парткомы дапамаглі гэтым комуністам стаць стаханаўцамі. Тут не саромеліся прымацоўваць да комуністаў беспартыйных рабочых, склікаць іх разам да таго часу, пакуль комуністы не аўладалі тэхнікай сваёй справы і не сталі стаханаўцамі.

У партарганізацыі фабрыкі «Комунарка» налічваецца 60 комуністаў. З іх толькі 8 чалавек працавалі непасрэдна ля варштата, а астатнія былі на падсобнай і некваліфікаванай працы, як пачынка халатаў і інш. Партком накіраваў да варштата 20 комуністаў, і гэта вельмі хутка адбілася на разгортванні стаханаўскага руху на фабрыцы. Аўтарытэт гэтых комуністаў і ўсёй партарганізацыі ў цэлым намнога вырас. Члены партыі сапраўды сталі на чале стаханаўскага руху. Мякка-шакалалны цэх, які раней адставаў, стаў даваць 10 тон прадукцыі, замест 7. Стаханаўцы сталі цэнтральнай фігурай на фабрыцы. Вось наглядны прыклад: комуністка Сіндлер, пераведзеная з падсобнай работы ў мякка-шакаладны цэх, за кароткі час асвоіла тэхніку, стала лепшай стаханаўкай і пабіла ўсе папярэднія рэкорды. Зарплата яе вырасла са 130 рублёў да 300.

Агітатар другога пашывачнага цэха фабрыкі імя Кагановіча тав. Фрыдлянд сваімі сістэматычнымі гутаркамі і масавай работай завяваў вялікі аўтарытэт у рабочых. НА ЗДЫМКУ — тав. Фрыдлянд праводзіць гутарку.

4. МАЙСТРЫ БОЛЬШЭВІЦКАЙ АГІТАЦЫІ

Вялікая месца ў партыйнай рабоце пачала займаць палітычная агітацыя. Наладжваецца работа агітацыйных калектываў. На фабрыцы «Кастрычнік» былі праведзены 10-дзённыя курсы з адрывам ад вытворчасці для вялікай групы агітатараў. На гэтых курсах слухачы вывучалі геаграфію, знаёміліся з метадамі большэвіцкай агітацыі. Працуе семінар агітатараў у партарганізацыях фабрык імя Кагановіча, імя Куйбышэва, на заводзе імя Кірава, на «Комунарцы», у друкарні імя Сталіна. У гэтых арганізацыях вырас значны актыў сапраўдных майстроў большэвіцкай агітацыі, якія ўмеюць на канкрэтных прыкладах з жыцця цэха, брыгады, завода растлумачваць вялікія палітычныя пытанні.

На фабрыцы імя Куйбышэва для таго, каб растлумачыць рабочым значэнне 15-годдзя пагранаховы, запрасілі бацьку пагранічніка, былога рабочага фабрыкі тав. Старобіна. З вялікай гордасцю расказаў рабочым тав. Старобін, як яго сын ахоўвае далёка-ўсходнія граніцы, прывёў асобныя вытрымкі з пісем сына. Усё гэта рабочыя выслухалі з вялікай увагай. У выніку гэтага значна ажывілася абарончая работа на фабрыцы.

Для таго, каб агітацыя была канкрэтнай і дзейснай, агітатар той-жа фабрыкі, тав. Гомер бывае на кватэрах рабочых свайго цэха і цікавіцца ўмовамі іх жыцця. Пасля кожнай гутаркі тав. Гомер запісвае пытанні, якія найбольш цікавяць рабочых. За апошні час ён сабраў 40 розных пытанняў па міжнароднаму і ўнутранаму становішчу. Не дзіва, што гутаркі тав. Гомера заўсёды збіраюць шмат слухачоў.

Майстрам большэвіцкай агітацыі з'яўляецца і тав. Фрыдлянд з завода імя Кагановіча. Яго гутаркі песна ўвязаны з практычнай работай і асноўнымі задачамі партыйнай арганізацыі. Тав. Фрыдлянд сваёй агітацыяй дапамагае знішчэнню раду непаладак у цэху. Ён выкрыў майстра, які сабатаваў разгортванне стаханаўскага руху.

Тав. Фрыдлянд, раней чым падабраць тэму для гутаркі, раіцца з рабочымі, даведваецца, якія пытанні больш за ўсё іх цікавяць. Так, адзін рабочы запытаў у яго, якія тавары вывозіць наша краіна за межы. Тав. Фрыдлянд гэтаму рабочаму адразу не даў адказу, а папрасіў яго пачакаць, пакуль ён падрыхтуецца, а потым правёў гутарку на гэту тэму.

Зразумела, ёсць і адмоўныя з'явішчы ў пастаноўцы партыйнай агітацыі. Ёсць факты фармальных адносін агітатараў да сваіх партыйных абавязкаў, факты недастаткоавй дапамогі агітатарам з боку партыйных камітэтаў.

Партыйныя арганізацыі Менска прарабілі нямала ў справе павышэння ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню комуністаў. Тэарэтычныя канферэнцыі, якія праводзіліся на радзе прадпрыемстваў, дапаўняюць гэту работу. Але трэба сказаць, што магчымасці ў Менску значна большыя. Партыйная арганізацыя Менска мае вялікую колькасць падрыхтаваных прапагандыстаў, выкладчыкаў, кваліфікаваных партыйных сіл. І таму мы ў праве патрабаваць ад менскай арганізацыі значна большага.

Асноўны недахоп у партыйнай прапагандзе ў пярвічных арганізацыях Менска — гэта недастатковая ўвага да падрыхтоўкі прапагандысцкіх кадраў са свайго асяроддзя, думка аб тым, што прапагандыста абавязкова павінен прысласць гаркам. Большасць партыйных камітэтаў і да гэтага часу агульна кіруюць зместам партыйнай прапаганды, не ўваходзячы ў такія дэталі, як канспекты, рабочыя запісы, наглядныя ілюстрацыі. Мала практыкуецца, як прапагандысты рыхтуюцца і праводзяць партыйныя заняткі. Партыйныя габінеты не сталі сапраўднымі ачагамі партыйнай культуры, лабараторыямі большэвіцкай прапаганды.

5. ІНСТРУКТАР І ПЛАН РАБОТЫ

Мы ў гэтым артыкуле галоўным чынам прыводзім станоўчыя моманты з работы раду пярвічных партарганізацый Менска. Але ў сваёй рабоце мы сустракаліся з радам адмоўных з'явішч. Так, у нас склалася думка, што некаторыя парткомы і сакратары парткомаў хварэюць агульнасцю ў рабоце, даюць агульныя дырэктывы замест жывой і канкрэтнай работы з кожным комуністам. Зусім мала займаюцца партыйныя арганізацыі праверкай выканання сваіх уласных настаноў. Недастаткова кіруюць партыйнымі арганізатарамі.

Мы былі ў партыйнай арганізацыі горжылсаюза (сакратар тав. Дордгіс), якая наогул яшчэ не перабудавала сваёй работы. План работы парткома нічым не адрозніваецца ад плана праўлення горжылсаюза. І тут і там планы складзены на цэлы квартал. Партарганізацыя намячае заслухаць даклад аб выкананні заданняў першага квартала, даклады аб ходзе капітальнага рамонту па жакту № 25, справаздачу аб працы жактаў № 9 і 4.

Такімі пытаннямі з пачатку да канца насычан увесь план. Зразумела, што сакратар парткома не разазнаваўся ў такіх дэталях, як задачы. Тав. Дордгіс нам заявіла, што інструктар райкома прызнаў гэты план добрым і ніякіх заўваг не зрабіў. І як відаць (у гэтым мы пераканаліся на пленуме Кагановіцкага райкома) гэта арганізацыя далёка не адзіная ў горадзе.

Нашу крытыку недахопаў менскія таварышы прынялі, таксама як мы прынялі крытыку менскай брыгады, за здаровую таварыскую дапамогу.

Далейшы абмен вопытам, сустрэчы паміж актывам буйнейшых партарганізацый, узаемная крытыка недахопаў дапамогуць нам узняць узровень нашай работы на новую, больш значную вышыню. Гэта самы важны і істотны вынік сустрэч паміж актывам партарганізацый Менска і Гомеля.

Брыгада Гомельскага гаркома партыі: ПАЛЯШЧУК, КАЦМАН, МІСЛАВЕЦ, КАРАНТАЕР, САЛАВЕЙ, МІНЕВІЧ, ЛІЦІНА, ХОДАСАЎ, РУСЕЦКАЯ, КАНТАР.

СТАКУН
Сакратар Гомельскага гаркома КП(б)Б.

ДЗЕЛАВАЯ, ТАВАРЫСКАЯ ДАПАМОГА

Абмен вопытам партработы — вялікая справа. Таму мы з задаваленнем прынялі прапанову рэдакцыі газеты «Звязда» аб арганізацыі абмену вопытам паміж менскай і гомельскай партарганізацыямі. Гэта мерапрыемства ў нашай партарганізацыі выклікала велізарнейшы інтарэс не толькі ў асяродку партыйнага актыва, але і сярод шырокай масы членаў партыі.

Прыезд брыгады Менскага гаркома павысіў настрой партработнікаў, прымусіў нас крытычна глянуць на сваю работу, выклікаў вялікі інтарэс да работы менскай партарганізацыі, унёс найсур'ёзнейшы элемент спаборніцтва. Бясспрэчна, што вынікі работы брыгад абодвух гаркомаў паглыбяць гэтыя настроі і адыграюць вельмі вялікую ролю у далейшым ажыўленні і паляпшэнні якасці арганізацыйна-партыйнай і палітычна-масавай работы нашых партарганізацый.

Брыгада Менскага гаркома дала, безумоўна, правільныя вывады аб рабоце гомельскай партарганізацыі, выкрыла рад сур'ёзных упушчэнняў і недахопаў у рабоце пярвічных партарганізацый і гаркома партыі. За ліквідацыю гэтых недахопаў мы ўжо ўзяліся. Асабліва істотна і важна крытыка брыгадай недахопаў партработы, звязаных з абменам партдакументаў. Таварышы з Менска зусім правільна крытыкавалі нас за павольны разрыў паміж абменам партыйных дакументаў і ўзыдмам усёй арганізацыйна-партыйнай і выхаваўчай работы. Гэта сур'ёзнейшы недахоп, на ліквідацыю якога мы цяпер мабілізуем арганізацыю. Трэба адначыць рад недахопаў у арганізацыі работы брыгады. Па-першае, брыгада павінна была быць больш рознастайнай па свайму складу, у яе павінны былі ўваходзіць таварышы з розных галін партыйнай работы. Па-другое, мы недаацанілі значэння прыезду да нас таварышоў з Менска і арганізавалі работу брыгады наспех. Гэта таксама ў паўнай меры звузіла работу брыгады.

Трэба адзначыць, як недахоп, і тое, што ў вывадах брыгады не аказалася многіх каштоўных заўваг таварышоў па пытаннях кіраўніцтва стаханаўскім рухам і работы са спачуваючымі. Усе гэтыя недахопы, аднак, не змяншаюць велізарнай каштоўнасці работы брыгады.

Вывады работ абодвух брыгад мы абмяркуем у сябе на бюро гаркома і ва ўсіх пярвічных партарганізацыях. Пастараемся ўзоры работы лепшых арганізацый зрабіць здабыткам усіх большэвікоў Гомельшчыны. Узаемную пасылку брыгад Гомельскага і Менскага гаркомаў па абмену вопытам партыйнай работы трэба сістэматычна паўтараць.

Нам пажадана глыбей азнаёміцца з вопытам менскай партарганізацыі ў такіх галінах работы, як пастаноўка партыйнай і тэхнічнай вучобы, кіраўніцтва стаханаўскім рухам на прадпрыемствах, у пахах, органаў на прадпрыемствах, палітычная агітацыя, парткіраўніцтва комсамолам, работа са спачуваючымі. У далейшым можна было-б пакомаў па вывучэнню асобных галін работы. Адным словам, той сувязі, якая ўстанавілася паміж партарганізацыямі Менска і Гомеля, ні ў якім выпадку нельга аслабляць.

РАЁННЫ ПАРТЫЙНЫ ГАБІНЕТ

Раённы партгабінет Кагановіцкага райкома партыі (Менск) працуе ўсяго 3 тыдні. Партгабінет добра абсталёван. Пры ім ёсць бібліятэка і чытальня, якія налічваюць звыш 15 тыс. тамоў кніг, што поўнасцю забяспечвае наш актыў.

Партгабінет знаходзіцца ў Доме ўрада. Тут працуе вялікая колькасць прапагандыстаў, якія вядуць прапагандысцкую работу не толькі ў партарганізацыі Дома ўрада, але і ва ўсёй партыйнай арганізацыі раёна.

З 4 па 26 мая рознымі мерапрыемствамі для агітатараў і прапагандыстаў ахоплена 655 чал. Пры партгабінеце створана 9 семінараў, якія ахапляюць прапагандыстаў, партактыў раёна, партыйны рэзерв, рэдактараў шматтыражак і насценгазет, прапагандыстаў комсамольскай сеткі. Намечана таксама стварыць семінар рэспубліканскага актыва. Работа з прапагандыстамі вядзецца дыферэнцыявана. Семінарамі кіруюць лепшыя сілы раёна.

Але не толькі гэтым вычэрпваецца работа з прапагандыстамі. Прапагандыст зусім закона патрабуе ад яго канкрэтнай работы з кожным слухачом, ад умення вывучаць слухачоў, іх запатрабаванняў, іх настрояў. Прапагандыст павінен ведаць, чым жыве яго слухач, якія пытанні яго цікавяць, якія кнігі ён чытае, якія газеты выпісвае. Гэта дапаможа прапагандысту правільна падабраць літаратуру, правільна падабраць факты, прыклады, правільна падабраць тэму для гутаркі, правільна падабраць форму гутаркі.

Партгабінет прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы гуртковцаў, да раённай тэарэтычнай канферэнцыі па тэме: вучэнне Леніна—Сталіна аб партыі. За час падрыхтоўкі да гэтай канферэнцыі праведзена 115 канспектаў удзельнікаў канферэнцыі. Даны кансультацыі і ўказанні па гэтых канспектах.

У раённай тэарэтычнай канферэнцыі ўдзельнічалі 80 гуртковых і 10 партыйных арганізацый.

Райком партыі арганізаваў пры партыйным габінеце цыкл лекцый па фізічнай і эканамічнай геаграфіі. Гэта мерапрыемства выклікана тым, што значная колькасць прапагандыстаў слаба ведае геаграфію. Ужо праведзены тэмы: прыродныя багацці СССР і размяшчэнне прамысловасці СССР. Аб гэтых заняткach вельмі добра адклікаюцца прапагандысты.

Партыйны габінет арганізаваў работу і з агітатарамі. У апошні час праведзены кансультацыі па такіх пытаннях: японскі імперыялізм і Мангольская Народная Рэспубліка, перамога народнага фронта ў Францыі і Іспаніі, савецка-французскі пакт і разрыў Германіяй лакарнскага дагавору і інш.

Гэтыхтэм цыкл лекцый па матэрыяльнай літаратуры. Вось першыя крокі работы партгабінета.

Загадчык райпартгабінета ЛІЎШЫЦ.

ЦЯГАНІНА

(Пісьмо курсанта)

Згодна загаду Наркамзема Саюза ССР ад 19 красавіка 1935 года, тыя арганізацыі (МТС, райза), якія камандзіруюць на курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы работнікаў па калгаснаму ўчоту, павінны ім выплачваць заработную плату: за першыя тры месяцы поўнасцю, за астатнія—дзве трэці.

Але зусім інакш зрабілі з загадам у Дрыбінскай МТС (дзе я працаваў у якасці сакратара). Камандзіраваўшы мяне на курсы інструктароў-бухгалтараў па калгаснаму ўчоту пры Наркамземе, упарта адмовіліся выплачваць мне належачыя грошы.

Пасля таго, як былі пасланы дакументы ў Наркамзем Беларусі, я прапрацаваў у МТС яшчэ адзін месяц. І аднаго разу дырэктар МТС т. Клімовіч мне заявіў.

— Мы знайшлі сабе добрага сакратара, цябе хутка выклічуць на вучобу, дык ты падай заяву, каб мы цябе вызвалілі ад работы ў сувязі з ад'ездам на вучобу.

Я так і зрабіў.

Цяпер, не глядзячы на неаднаразовыя адносіны Наркамзема Беларусі аб тэрміновай высылцы мне за пяць месяцаў заработнай платы, Клімовіч адмовіўся выплачваць грошы, спасылаючыся на тое, што я зволіўся «па асабістаму жаданню».

Ці доўга яшчэ будзе працаўжацца гэта цяганіна?

С. КАСЯНКОЎ.

АДОБРЫЛІ І... ЗАХАВАЛІ ПАД СУКНО

(Пісьмо агранома)

Я вучыўся ў Горацкім сельскагаспадарчым інстытуце. У парадку выканання дыпломнай работы правёў доследы на вывучэнню ўплыву розных норм фасфарытнай мукі на ўраджай вікаўсянай мешаніны.

У чэрвені мінулага года абараніў дыпломную работу на выдатна. Кваліфікацыйнай камісіяй яна была прызначана да змяшчэння ў друку, як маючая вялікае значэнне для сельскай гаспадаркі.

Мінуў год, а мой матэрыял дагэтуль марынуецца ў загадчыка кафедры прафесара Лупіновіча. Некалькі раз я звяртаўся ў інстытут з запытаннем аб далейшым лёсе маёй работы, аднак ніякага адказу атруль не маю.

ЛЯНДРЭС.

ПАРУШАЛЬНІКІ ЗАКОНАЎ

(Пісьмо рабочага)

Наш соўгас «Пролетарый» (Касцюковіцкі раён) за дрэнную падрыхтоўку і правядзенне веснавой сяўбы занесен на чорную дошку.

Гэта атрымалася таму, што ў соўгасе няма добрага кіраўніцтва. Дагавары з калгасамі не заключаны. Праноўная дыспыліна адсутнічае, заработную плату рабочыя атрымліваюць неакуратна. Мы распісаліся ў авансавым лісту, але грошай нам не далі, заявіўшы, што гэты ліпток перададуць у сталоўку, адкуль мы зможам атрымліваць харчаванне.

МІШКІН.

НЕ ПРАЦУЮЦЬ ВЯЧЭРНІЯ ШКОЛЫ

У Ганчанскім сельсовеце, Клічаўскага раёна, зрываецца навучанне малапісьменных. Амаль ні ў адным калгасе няма рэгулярных заняткаў у школах для дарослых. Многія школы на працягу года да работы не прыступалі.

ХАРЛАН.

ЯСЛІ БЕЗ ДОГЛЯДУ

У яслях пры калгасе «Южны» (Крупецкі сельсовет. Добрушскага раёна) адсутнічае належны догляд дзяцей. Дзеці бяцца паміж сабою, кідаюць каменні ў пыбы і ў праходзячых, бегаюць услед за аўтамабілямі і трактарамі.

Ніякіх цацак у яслях няма.

БЕРДНІКАЎ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЗВЯЗДЫ»

«УВАГА ЗЕМЛЕУПАРАДЧЫКАМ»

У «Звяздзе» пад такой назвай было змешчана пісьмо землеўпарадчыка тав. Дайкоўскага а Плешчаніц.

Старшыня Плешчаніцкага райвыканкома паведаміў нам, што па гэтаму пісьму прыняты меры. За нясвоечасовае прадастаўленне рабочай сілы землеупарадчыкам райвыканкомам прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці старшыні калгасаў «Трэці рашаючы» — Гарахавік і «Пролетарый» — Стрыга.

Запазычанасць на зарплаце землеўпарадчыкам ліквідавана

«МАРУДЗЯЦЬ З РАМОНТАМ»

На змешчаную заметку пад гэтым загалоўкам у «Звяздзе» дырэктар віцебскага ільнотрэста паведаміў нам, што па сутнасці заметкі прыняты меры.

Запчасткі Глоданскаму ільнозаводу (Лёзненскі раён) адгружаны. Капітальны рамонт гэтага завода закончан і гэтымі днямі будзе прыманца з рамонту.

Лепшая даярка племгаса імя XVII партз'езда, Нікольскага раёна, Курскай вобласці тав. М. Ерэміна, узнагароджаная ордэнам Леніна, прэміравана племгасам пуцёўкай у санаторый. НА ЗДЫМКУ — бацька і сястра Ерэмінай праважаюць ордэнаноску на курорт (справа т. Ерэміна).

Фота Лісіцына (Саюзфота).

У МАЗЫРЫ ЗРЫВАЕЦЦА БУДАЎНІЦТВА ЗЕРНАСУШЫЛАК

Яшчэ 10 сакавіка мазырскі райземаддзел даў 13 калгасам раёна дырэктыву аб неадкладным разгортванні будаўніцтва зернасушылак Уварава. Старшыням калгасаў было прапанавана ўзяць будаўніцтва над свой нагляд і кожную дэкаду інфармаваць райземаддзел аб ходзе будаўніцтва.

Прайшоў сакавік, палова красавіка, інфармацыя ні адкуль не паступала. Тады райземаддзел паразшоў праверыць — будуюцца зернасушылкі ці не. Аказалася, што ні адзін калгас да будаўніцтва не прыступіў, бо ніхто не ведаў, як трэба будаваць зернасушылку Уварава.

Пасля гэтага загадчык райземаддзела **Буянкоў** абавязаў свайго тэхніка-будаўніка **Свідрыцкага** пабудаваць у адным з калгасаў узорную зернасушылку, каб паказаць яе ўсім астатнім калгасам. 17 красавіка будаўніцтва такой зернасушылкі пачалося ў сельскагаспадарчай арцелі «Ударнік», Юравіцкага сельсавета. Але працягвалася будаўніцтва нядоўга. Тэхнік Свідрыцкі заняўся другой работай — будаўніцтвам ветлячабінцы — і ў калгас не заглядваў. Так і стаіць няскончанай «узорная» зернасушылка. Паказаць калгасам у натуры няма чаго. Будаўнічых праектаў таксама не далі. У рэзультаце справа з будаўніцтвам не рушыцца з месца.

Што датычыць прымітыўных зернасушылак, якія павінны быць пабудаваны ў кожным калгасе, то апошнія райземаддзелам зусім скінуты з рахунку. Аб разгортванні будаўніцтва іх калгасам нават не было дана ўказанняў, не гаворачы ўжо аб тэхнічнай дапамозе.

Такімі-ж метадамі будаўніцтвам зернасушылак кіруе РВК. Старшыня райвыканкома **Жогаў** успомніў пра зернасушылкі толькі 19 мая. У тэрміновым парадку было склікана пасяджэнне прэзідыума райвыканкома. Для інфармацыі выклікалі старшыню калгаса «Калгаснік Мазыршчыны» тав. **Рафальскага**. Інфармацыя была кароткая. Зернасушылка ў калгасе не будуецца і ніхто не ведае, як трэба яе будаваць.

Рафальскаму абяцалі дапамагчы, а ён у сваю чаргу абяцаў зараз-жа прыступіць да будаўніцтва зернасушылкі і скончыць яе да 15 чэрвеня. Але ніхто да Рафальскага ў калгас не прыехаў, ніхто не паказаў, як трэба будаваць. У рэзультаце на сённешні дзень зернасушылка не будуецца.

Пытанне законнае запытанне. Якжа глядзіць на такое агіднае становішча з будаўніцтвам зернасушылак, раённы камітэт партыі? Яго голасу пакуль што не чуваць.

Р. ФРАЛОЎ.

УБОРАЧНЫЯ МАШЫНЫ ІРЖАВЕЮЦЬ

Калгасы Смалявіцкага раёна не рыхтуюць машын да ўборкі ўраджаю. Да першага чэрвеня патрэбна было адрамантаваць 185 жнярак, 50 сенакасілак і 60 конных грабель. Аднак, рамонт жнярак, сенакасілак і грабель не пачаты амаль ні ў адным калгасе.

У калгасе «Колас», Варатоўскага сельсавета, ёсць пяць жнярак і 2 сенакасілкі. Машыны гэтыя стаяць пад павеццю пераскіданымі, іржавеюць і псуюцца. Да жнярак калгас атрымаў запасныя часткі, але яны яшчэ не выбраны са склалу.

Адкладваецца рамонт жнярак у калгасах імя **Куйбышэва, «Прагрэс»** і ў радзе іншых. У калгасе «Прагрэс» не агледжана яшчэ конная малатарня «БР-23», дзве сартыроўкі пакрыліся цвіллю, у смецці засталіся тыкоднікі зярна. Аглядаць сартыроўкі калгас зусім не збіраецца. Рамонт малатарань не пачаты ні ў адным калгасе. Патрабуюць рамонту 170 конных малатарань, 21 трыер, 326 зернавых веялак, 16 ільнотрашчотак.

У раёне паўтарааюпца памылкі мінулых гадоў, калі ў выніку дрэннага рамонту машын запягвалася ўборка, дапушчаліся вялікія страты ўраджаю.

А. ЛЯСНЫ.

ПАЧАЛІ КАСЬБУ

Калгас «1 мая». Слуцкага раёна, скасіў ужо 40 гектараў заліўной сенажаці. Калгасы «Ударнік» і «Чырвоны Скаўшын», Старобінскага раёна, скасілі больш чым па 4 гектары сенажаці.

У калгасе «1 мая» касцы разбіты на звенні. Паміж звеннямі разгорнута сацспаборніцтва на лепшае правядзенне сенаўборкі.

СКУЦЗНЯ.

ПРАПОЛКА КОК-САГІЗА

Перадавы калгас «Ударнік», Крычаўскага раёна, пачаў праполку кок-сагіза, пасеянага гэтай вясной на плошчы аднаго гектара.

Усходы кок-сагіза добрыя, даходзяць да 10 сантыметраў. Праполка праходзіць ужо трэці дзень.

Ю. СНЫТКО.

КАЛГАСНІКІ ЕДУЦЬ НА КУРОРТ

Праўленне І агульны сход калгаса «Іскра калектывізацыі», Зенькаўскага сельсавета, Уздзенскага раёна, разышлі паслаць сваіх лепшых калгаснікаў ЛУКАША ЧЫКУНА і КОЛАСА на курорт. Чыкуну куплена курсоўка на адзін месяц, Коласу — на паўтара месяца. Яны выехалі на кумысны курорт у горад Орэнбург.

Чыкун Лукаш — старэйшы калгаснік-стаханавец. Колас — брыгадзір перадавой першай брыгады, якая ў мінулым годзе з пасобных гектараў зняла па 21 цэнтнеру аўса.

А. РУДАМІНСКІ.

„МІЖПАПАРНЫЯ" НАСТРОІ

СМАЛЯВІЧЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Палі калгаса «Пабеда», Амяльянаўскага сельсавета, зарастаюць пустазеллем. Над пшаніцай высока ўзнімаюцца жытнія каласы. Пшаніца засмечана васількамі, пырнікам і іншым пустазеллем. Яравыя, асабліва ячмень, заглушаюцца свірэпкай, якая на ранніх пасевах ужо адцвіла.

Догляд пасеваў у калгасе не арганізован. Дагэтуль не праполата ні аднаго гектара. Праполка азімага жыта і пшаніцы сарвана. У брыгадах яшчэ не вылучаны звенні прапольшчыц.

— Суха, няма чаго палоць, — заяўляе старшыня калгаса Матусевіч.

Старшыня калгаса не ведае, што робіцца ў яго на полі. Сам ён рэдка калі аглядае пасевы. Калгаснікі другі тыдзень працуюць на сваіх агародах, а на праполцы няма нікога.

Такое становішча ў большасці калгасаў Амяльянаўскага сельсавета. Праполка азімых сарвана, а праполку яравых не пачынаў ні адзін калгас. Усюды заяўляюць, што няма чаго палоць, у той час, як пустазелле губіць пасевы.

Старшыня калгаса «Уперад», Пліскага сельсавета, Ліх адмаўляецца праполваць пасевы па тых-жа матывах, што мала пустазелля. Ні аднаго гектара не праполата ў калгасах «Колас» і імя Куйбышэва, Варатоўскага сельсавета.

Праполка азімых у раёне фактычна сарвана. Жыта пачынае красаваць. Да праполкі яравых прыступілі толькі асобныя калгасы. Па зводцы райземаддзела на 25 мая праполата толькі 62 гектары.

Там, дзе праполка пачалася, работа арганізавана дрэнна. У буйнейшым калгасе «Перамога» звенні існуюць толькі на паперы, а работа праходзіць скопам. Прапольшчыцы не ведаюць нормы, няма індывідуальнай здзельшчыны. У калгасе «Прагрэс» з 30 жанчын на праполцы занята толькі 8. Паміж калгаснікамі не разгорнута спаборніцтва.

Ніхто ў раёне не кіруе ходам праполкі. На полі не знойдзеш агранома. Загадчык райземаддзела **Нішчым** і яго работнікі толькі тым і заняты, што збіраюць весткі. А вось як праходзіць праполка і ворыва папараў — райземаддзел не ведае.

Да рэчы аб папарах. Тав. Нішчык і загадчык сельгасаддзела РК КП(б)Б тав. **Кірэеў** тлумачань, што ў іх раёне мала папараў і амаль усе падняты. Ці так гэта на самой справе?

Калгас імя Куйбышэва мае 100 гектараў папару. Ворыва зусім не пачыналі. 60 гектараў папараў не паднята ў калгасе «Чырвоны штандар», Пліскага сельсавета. Такіх калгасаў у раёне налічваюцца дзесяткі.

Не гледзячы на гэта, трактарны парк і коні на ворыве папараў не працуюць. МТС зняла ўсе трактары і толькі 6 «ХТЗ» працуюць на падняцці цалін.

— Мы ўжо закончылі папары,— гаворыць дырэктар машына-трактарнай станцыі тав. **Басалыга.**

У гэты час амаль ва ўсіх калгасах на некалькі дзесяткаў гектараў папару не паднята. У калгасе «Прагрэс» каля тыдня стаіць трактар. 26 гектараў папару, якія навіна ўзараць МТС па дагавору з калгасам, не падняты. Трактары брыгады № 6 пастаўлены на рамонт. Трактары стаяць ужо шосты дзень. Іх ніхто не рамантуе. Тым часам яны маглі падняць увесь папар.

Раённыя партыйныя, совецкія і земельныя арганізацыі Смалявіцкага раёна не ўзначалілі барацьбы за ўраджай у другім туры палявых работ. Праполкай і ворывам папараў абсалютна ніхто не кіруе. Дырэкцыя МТС пельмі рэдка бывае ў калгасах сваёй зоны абслугоўвання. Скончылася веснавая сяўба і МТС ахапілі «міжпапарныя» настроі. У баку ад праполкі і ворыва папараў стаіць і раённы земельны аддзел.

А. ЛОСЬ.

ЗА ПРАПОЛКУ НІХТО НЕ АДКАЗВАЕ

СМІЛАВІЧЫ. (Спец. кар. «Звязды»). Дружныя усходы і быстры рост пасеваў абяцаюць калгасам багаты ўраджай. Жыта мясцамі пачало красавацъ, густою ёлкаю ідзе лён. Пачала паказвацца бульба. Але ёсць адна небяспека. У раёне заханіліся поспехамі сяўбы, добрымі ўсходамі і зусім забылі пра далейшы догляд пасеваў — праполку.

Жыта парасло добрае, але яго не прапалолі. Ведаюць аб гэтым і райза і МТС, але не прынялі ніякіх мер, каб добра і своечасова прапалоць яравыя. На 25 мая калгасы прапалолі толькі 0,2 проц. яравых і 4,2 проц. ільну.

Першыя дні праполкі паказалі, што ў раёне ніхто гэтай работай не цікавіцца. Возьмем такі сельсавет, як Цытвянскі. Тут палымі днямі памяшканне закрыта. 28 мая старшыня паехаў у Смілавічы, намеснік таксама адсутнічаў. 29 мая сакратар паехаў у Рудзенск. Усе справы і памяшканне перадалі дзяжурнаму. 30 у сельсавеце нікога не было, а 31 выходны.

Тав. Сепазнёва Васіліса Ермалаеўна — загадчыца свінагадоўчай і буйагародняй фермы калгаса «Беларуская вёска», Лёзненскага раёна, узнагароджаная ордэнам Чырвонага Працоўнага сцяга.

Фота С. МІРМОВІЧА.

З праполкаю ў сельсавеце няважна. Возьмем калгас імя 11 ліпеня. Ільну тут пасеяна 35 гектараў.

Ільняное поле разбілі на ўчасткі, замацавалі іх за людзьмі і на гэтым спынілі клопаты аб ільне. Ні адна калгаснiца не ведае, колькі яна за дзень выпрапоўвае і якія нормы на праполцы існуюць.

Каб доўга не траціць часу, праўленне калгаса ўзяло прыкладныя нормы Наркамзема за 1935 год, перакрасліла там старыя лічбы і зверху напісала свае. Але і гэтых норм, як відаць, ніхто нідзе не абгаварваў. Адзін брыгадзір гаворыць, што норма праполкі ільну ў дзень — 0,03 гектара, у канцылярыі калгаса ісиуе свая норма — ад 0,05 да 0,07. Старшыня калгаса тав. Сапун мае свае нормы — 0,04, у той час, як норма Наркамзема па праполцы ільну ўстаноўлена 0,15—0,25.

З такімі блытанымі нормамі пачалі ў калгасе праполку ільну і агароду, але і гэтыя нормы не выконваюцца. Адзін участак у 0,18 полюць на працягу шасці дзён.

Мала гэтага, на праполку жанчыны поўнасцю не выходзяць, а лён зарос пырнікам і свірэпкай.

У брыгадзе тав. Шэлега кожны дзень на праполку можа выходзіць 35 жанчын, а выходзіць толькі 5—7.

Калгаснiцы Н. Рысавец, Жаркевіч і Насалоўская з пасёлка «Новы свет», М. Букаціч з пасёлка «Палыроза», В. Юхневіч з в. Цытва на праполку ільну не выходзяць.

Старшыня калгаса бездапаможна разводзіць рукамі: — Ну, што я магу зрабіць, калі яны не хочуць працаваць.

Праполка праходзіць надзвычай дрэнна. Пустазелле пасля праполкі пакідаюць тут-жа каля пасеваў. Яно ўрастае ў зямлю і засмечвае глебу.

Калгасы Цытвянскага сельсавета абслугоўваюцца МТС, але апошняя з'яўляецца толькі выканаўцам работ. Павышэнне ўраджайнасці яе не датычыць. За арганізацыю работы на праполцы ніхто ў раёне не адказвае.

Д. МАЛЕВІЧ.



ДНЕПРАПЕТРОЎСК УПАРАДКОЎВАЕЦЦА. НА ЗДЫМКУ: праспект Карла Маркса. Фота Угрыновіча (Саюзфота).

ПАСЛЯ ЗАНЯТКАЎ

У нашай шчаслівай квітнеючай краіне аддаецца выключная ўвага выхаванню дзяцей. Партыя, вялікі Сталін, наш совецкі ўрад акружылі пяплымі бацькаўскімі клопатамі школу, настаўнікаў, тых, каму даверана ганаровая задача — выхаванне маладога пакалення краіны соцыялізма. Школа робіць велізарны ўплыў на натуру, тэмперамент, паводзіны дзіцяці і падростка.

Але-ж вучань знаходзіцца ў школе толькі 5—6 гадзін у дзень. З іх паўтары гадзіны ідзе на перапынкі (яду, гульні, адпачынак). Астатні час школьнік знаходзіцца дома.

Як-жа арганізуецца вольны ад вучобы час школьніка? Безумоўна што за выхаванне дзяцей па-за школай адказваюць бацькі. Яны абавязаны саўпаць за правільным выкарыстаннем вольнага часу, правільным адпачынкам, за паводзінамі дзіцяці. Аднак, гэта ніколькі не здымае адказнасці з самой школы. Школа павінна быць звязана з бацькамі вучняў, цікавіцца, як яны праводзяць свой адпачынак, уплываць на вучняў не толькі калі яны знаходзяцца ў школе, але і пасля заняткаў. І ўжо тым больш школа нясе адказнасць за арганізацыю правільнага скарыстання перапынкаў паміж урокамі.

Факты сведчаць, аднак, што ў радзе школ гэтага яшчэ не зразумелі. Нярэдкі выпадкі, калі вучні ў перапынку паміж заняткамі і пасля іх прадастаўлены самі сабе. Яны пападаюць пад уплыў «вуліцы». Ёсць выпадкі, калі цэлыя класы арганізуюць паміж сабою бойкі.

Гэта не можа не адбівацца і на самой вучобе. Вядомы выпадкі, калі дзеці з выдатнікаў вучобы, у выніку адсутнасці нагляду за імі, пусюцца, пачынаюць адставаць ад вучобы.

З Віцебска нам паведамляюць, што во многіх школах, асабліва ў школе № 13 сярод вучняў квітнее хуліганства. Кіраўнікі і настаўнікі школ не звяртаюць на гэта ўвагі. Да вучняў, якія сістэматычна разлагаюць свае класы, не прымаюць ніякіх выхаваўчых мер. Наадварот, гэтыя вучні адчуваюць сябе «героямі школы». Перапынкі паміж заняткамі праходзяць безалаберна, арганізацыйна-культурная работа не наладжана. З вучнямі-піянерамі таксама не праводзіцца выхаваўчая работа.

Такое становішча ў далейшым нельга цярпець. Школы абавязаны арганізаваць культурны адпачынак вучняў, сачыць за іх паводзінамі не толькі ў самой школе, але і па-за ёю.

У бліжэйшы час канчаецца навучальны год, пачынаюцца летнія канікулы. Дзесяткі тысяч школьнікаў, здаўшы апошні іспыт, выйдуць са школы з тым, каб на працягу двух з паловай месяцаў адпачыць.

Што-ж будуць рабіць школьнікі у гэты час, як правядуць яны свае канікулы?

Значная частка школьнікаў разъязджаецца ў летнія піонерскія лагеры, на дачы, курорты у дамы адпачынку. Але не ўсе. Вялікая колькасць школьнікаў застаецца дома. Яны таксама павінны культурна адпачыць. Гэты адпачынак абавязаны арганізаваць ім школы, жакты, кіруючыя мясцовыя арганізацыі. Між тым далёка не ўсюды школьнікі сустракаюць да сябе належную ўвагу з боку гэтых арганізацый.

27 мая ў «Звяздзе» была змешчана зусім правільная скарга піонераў, якія жывуць у доме № 32 па Ленінскай вуліцы (Менск), на старшыню жакта тав. Рагозіна, які бюракратычна адносіцца да іх патрабавання прывесці ў парадак двор. Рагозін не хоча зразумець, што двор — гэта месца, дзе дзеці праводзяць значную частку свайго часу, што гэта месца павінна быць чыстым, культурным.

Або возьмем такі факт. У Сненскім раёне месяц назад была арганізавана камісія па падрыхтоўцы да летняй аздараўленчай кампаніі дзяцей. Узначальвае камісію сам старшыня райвыканкома т. Вараб'ёў. Аднак, як піша ў рэдакцыю А. Махнач, карысці з гэтага мала. Камісія так і не прыступіла да арганізацыі аздараўленчай кампаніі.

У Даўжанскім сельсавеце, Клічаўскага раёна, арганізацыю летняга адпачынку вучняў разумеюць па-свойму. Тут лічаць, што паколькі школьнікі вызваляюцца на лета ад заняткаў, іх трэба нагрузіць іншай работай. І вось па ініцыятыве дырэктара даўжанскай няпоўнай сярэдняй школы на вучняў усклалі даволі салідны абавязак: праверыць выкананне дагавораў сацспаборніцтва па ўсіх калгасах сельсавета. Да больш дзікага абсурду дадумацца няжа!

Усе гэтыя факты сведчаць аб тым, што ў некаторых мясцах да арганізацыі летняга адпачынку школьніка адносяцца злачынна, бестурботна, не разумеюць, што гэта ёсць важнейшая палітычная справа.

Вучань выхоўваецца не толькі ў школе, але і па-за школай, пасля школы. Гэтага забываць нельга.

С. ГАЛКІН.

НА БУДАЎНІЦТВЕ СТАЛІНСКІХ ШКОЛ

На 20 мая па ўсіх сталінскіх школах сярэдні процант гатоўнасці складае 33,62. Між тым, па Гомелю на 20 мая сярэдні процант гатоўнасці складае толькі 29, па Віцебску — 31 замест 41, па Менску — 33 замест 42.

Прычынай невыканання плана з'яўляецца не толькі недахват матэрыялаў, але і дрэнная арганізацыя работ на асобных будоўлях і недахват рабочай сілы.

У Віцебску, нібы з-за адсутнасці аконных завес, на ўсіх будоўлях не ўстаўляюцца вокны, у той час, як у Белдзяржснабе іх, як кажуць, хоць адбаўляй. Абломаўскай непаваротлівасцю віцебскага ўчастка Белкомунбудтрэста толькі і магчыма тлумачыць адсутнасць аконных петляў.

На будоўлях паралельна не вядуцца ўсе віды работ. Кіраўніцтва віцебскага ўчастка Белкомунбудтрэста на чале з Ваданосавым лічыць патрэбным праводзіць толькі адзін від работы: раз ідзе кладка, не ўстаўляюць вокнаў, не пахрыхтоўваюць падшыўкі столяў, драўляных перагародак і т. д.

На будоўлях па вуліцы Бебеля і 1-й ударнай поўнасцю закончана цагельная кладка. Ёсць усе матэрыялы для пакрыцця даху, але чамусьці прарабы гэтых пабудоў яшчэ не прыступілі да гэтай работы.

Тормазам будаўніцтва школ у Менску з'яўляецца недахват цэменту і драўляных балок. Да 1 жніўня школы павінны быць гатовы, але Дзяржплан фонды на цэмент запланаваў на чэрвень і ліпень месяцы.

Дырэктар завода імя Молатава т. Карасік спецыяльна праязджаў па будоўлях і запаўняў прарабаў, што да 10 чэрвеня ўсе будоўлі ён забяспечыць драўлянымі балкамі. На сённешні дзень па вул. Мяснікова будаўніцтву школы пагражае прастой з-за адсутнасці балок.

Такая арганізацыя работ і бясплануасць снабжэння матэрыяламі не могуць забяспечыць сканчэнне будаўніцтва сталінскіх школ у тэрмін.

І. ЕСЬМАН.

ДОГЛЯД БУЛЬБЫ ПАСЛЯ ПАСАДКІ

Пасадка бульбы, як і сяўба іншых культур у БССР у гэтым годзе праведзена ў больш сцісліых тэрміны ў параўнанні з мінулым годам. Але гэта толькі пачатак барацьбы за высокі ўраджай. Няпер ураджай залежыць ад далейшага догляду пасеваў.

Першай работай на догляду бульбянага поля з'яўляецца баранаванне. Баранаваннем мы знішчаем пустазелле, корку і вядзем барацьбу з грыбковымі хваробамі ўсходаў, як напрыклад, рызактонія. Праведзеныя намі доследы паказваюць, што баранаванне змяншае захворванне рызактоніяй на 15—20 проц. і павялічвае ўраджай з гектара на 10—15 цэнтнераў.

Баранаванне патрэбна праводзіць праз 10—15 дзён пасля пасадкі, калі толькі пачнуць з'яўляцца пасобныя ўсходы. На лёгкіх пясчаных і супясчаных глебах трэба баранаваць лёгкімі боранамі ў два следы. Пры грабністай пасадцы, асабліва калі клубні былі пасаджаны мелка, баранаваць трэба лёгкімі боранамі, незалежна ад глебы. На такіх пасевах бывае дастаткова прабаранаваць лёгкай бараной у адзін след, інакш можна вывернуць усходы бульбы. Баранаванне ніяк нельга адкладваць да таго часу, калі з'явіцца ўсе ўсходы.

Пасля з'яўлення ўсходаў трэба аглядзець поле. У выпадку выяўлення на полі неўзышоўшых клубняў павінна быць зроблена пасадка прарошчанымі запаснымі клубнямі.

Следам за баранаваннем трэба праводзіць ўспульхненне міжраддзя конным планетам і ўспульхненне паміж кустамі ў радках ручнымі матыкамі. Успульхняюцца пасевы тады, калі расліны ўжо так падняліся, што баранаванне можа іх пашкодзіць, акучванне рабіць нельга, бо расліны малыя. Успульхненне праводзіцца конным планетам, або ручнымі матыкамі.

Акучваць трэба тады, калі расліны дасягнуць 15—20 сантыметраў вышыні, бо калі раней рабіць, то расліна можа лёгка засыпацца зямлёй. Акучнік трэба ўстанавіць так, каб ён не забіраў асабліва глыбока і добра прывальваў зямлю да раслін. Прысыпка зямлі да раслiны бульбы мае вельмі важнае значэнне — гэтым мы даем расліне магчымасць развіць больш карнеў, а ў выніку і клубняў. Апрача гэтага, акучваннем, таксама як і ўспульхненнем, знішчаецца пустазелле і корка.

Другое акучванне трэба рабіць праз 10—12 дзён пасля першага. Трэба размясціць усе работы па акучванню так, каб к пачатку цвіцення бульбы гэта работа была закончана. На цяжкіх глебах і ў сырыя гады бывае карысна акучваць не два, а тры разы. На лёгкіх глебах і калі мала выпадае вільгаці, тры разы акучваць не трэба, бо лішняе акучванне можа ў гэтым выпадку прынесці шкоду тым, што моцна высушыць глебу. У часе цвіцення бульбу акучваць нельга, бо к гэтаму перыяду расліны настолькі развіваюцца, што закрываюць барозны, і пры акучванні шмат кустоў будзе папсавана. Адначасова з акучваннем трэба прапольваць бульбу, бо акучнік можа знішчыць пустазелле толькі паміж радкамі, а ў радках яно астанецца. Адначасова з выдаленнем пустазелля будуць успульхнены трэбні барознаў.

Для атрымання высокіх ураджаяў адначасова з пералічанымі мерапрыемствамі па догляду бульбы неабходна праводзіць падкормку. Падкормка робіцца ў тых выпадках, калі перад пасадкай бульбы глеба недастаткова была ўгноена. З угнаенняў, якія ўжываюцца для падкормкі бульбы, больш за ўсё ўносяць азотныя і калійныя. Азотныя ўгнаенні ўносяць у адзін або два тэрміны, у залежнасці ад характару глебы і віду ўгнаення. Калі ўжываецца сульфатамоній, то на цяжкіх глебах яго ўносяць перад першым акучваннем, а на лёгкіх глебах неабходна рабіць падкормку ў два прыёмы — пры першым і другім акучванні.

У выпадку прымянення селітры падкормку можна рабіць у два прыёмы і на цяжкіх глебах.

Калі глеба не была ўгноена, або слаба ўгноена перад пасадкай бульбы, неабходна ўнесці разам з азотнымі ўгнаеннямі — калійнае і фосфарнае. У якасці калійных угнаенняў для гэтых мэт прыдатны — попел і калійная соль, але ні ў якім разе нельга ўжываць сільвінт. У якасці фосфарнага ўгнаення ўжываецца суперфасфат.

Дозы ўгнаенняў уносяцца ў залежнасці ад ступені ўгноенасці глебы. Калі глеба зусім не ўгнойвалася перад пасадкай бульбы, патрэбна ўнесці сульфатамонія 2—3 цэнтнеры на гектар у два тэрміны, 2,5—3 цэнт. суперфасфату і 2 цэнтнеры калійнай солі ў адзін тэрмін перад першым акучваннем. Замест калійнай солі можна ўносіць попел з разліку 7,5—10 цэнтнераў на гектар. А ў тых выпадках, калі глеба была ўгноена перад пасадкай бульбы, мінеральныя ўгнаенні ўносяцца ў зменшаных дазіроўках, у залежнасці ад угноенасці глебы: сульфатамонія 1—1,5 цэнтнера на гектар, калійнай солі каля 1—1,5 цэнтнера на гектар і суперфасфату 1,5 цэнтнера.

Прафесары Н. ДАРОЖКІН, Г. ПРАТАСЕНЯ.

На сустрэчы калектыва тэатра імя Мейерхольда з рабочымі абутковай фабрыкі імя Кагановіча. НА ЗДЫМКУ — Вс. Э. Мейерхольд і артысты тэатра глядзяць выступленні фабрычных гурткоў самадзейнасці.
Фота Я. Салавейчыка.

РАДАСНАЯ СУСТРЭЧА

Радасна і весела правялі ўчора рабочыя і работніцы абутковай фабрыкі імя Кагановіча свой выходны дзень. Надоўга застанецца ў памяці хвалюючая сустрэча з народным артыстам рэспублікі **Всеваладам Эмільевічам Мейерхольдам** і калектывам тэатра яго імя. Дружнымі апладысментамі і прывітальнымі воклічамі рабочы калектыў спаткаў выдатнага майстра тэатральнага мастацтва. Стаханаўкі фабрыкі паднеслі Всеваладу Эмільевічу кветкі.

Ад імя ўсяго калектыва намеснік дырэктара тэатра тав. **Атамян** дзякаваў за цёплую сустрэчу, аказаную тэатру прадоўжыць сталіцы ордэнаноснай БССР.

Стаханавец тав. **Давыдаў** вітаў калектыў тэатра ад імя рабочых і работніц абутковай фабрыкі.

Затым, сустрэты доўгімі воплескамі, выступіў народны артыст рэспублікі **В. З. Мейерхольд.**

У нашай шчаслівай краіне усё больш спіраюцца грані паміж фізічнай і разумовай працай, — сказаў Всевалод Эмільевіч. — Адначасова ўсё больш спіраюцца грані паміж прафесіяналамі тэатра і ўдзельнікамі самадзейнага мастацтва. Калі мы ў Маскве глядзелі самадзейнае мастацтва нацыянальных рэспублік, то мы бачылі, што яно вельмі ўзмацнілася, дае бліскучыя ўзоры. Мы, прафесіяналы, пяпер не глядзім на самадзейныя гурткі, як калісьці, зверху ўніз, а чэрпаем адтуль многае для сваёй уласнай работы.

У самадзейным мастацтве мы бачым здаровыя карэнні народнай творчасці. Фальклор—вялікая база для росту тэатра.

Пасля ўрачыстай часткі самадзейныя гурткі фабрыкі паказалі калектыву артыстаў тэатра імя Мейерхольда і рабочым фабрыкі сваю творчасць. Рускі драмгурток паставіў скетч «Сын» — Яроцкай, яўрэйскі драмгурток — скетч «Доктар»— Шолам-Алейхема.

З радам нумароў выступілі струнны, балетны і акрабатычны гурткі.

Артыст Громаў ад імя калектыва тэатра дзякаваў удзельнікаў самадзейнасці за выступленні і адзначыў, што гэтыя выступленні вельмі спадабаліся артыстам.

С. Г.

УСЕСАЮЗНАЯ ЗАОЧНАЯ РАДЫЁВЫСТАЎКА

Журы другой усесаюзнай заочнай радыёвыстаўкі адкрыла прыём апісання аматарскай апаратуры. Да ўдзелу ў выстаўцы прыцягваюцца ўсе радыёаматары Совецкага Саюза. Журы прымае апісанне розных самадзельных канструкцый, прыёмнікаў, узмацніцеляў, перадатчыкаў, перасовак, гаварыцеляў, тэлевізораў і т. д. Для прэміравання ўдзельнікаў заочнай выстаўкі Усесаюзны радыёкамітэт адпусціў 7 тыс. руб. Прэміі заочнікі атрымаюць радыёприёмнікамі, дэталямі і літаратурай.

Прадстаўленне экспанатаў на заочную выстаўку ў Маскву робіцца шляхам перасылкі на адрас журы падрабязнага апісання зробленай канструкцыі. Першы ўдзельнік заочнай радыёвыстаўкі з Совецкай Беларусі — тав. Музычэнка з гор. Веткі. Ён паслаў апісанне, чарцяжы і фотаздымкі свайго прыёмніка, тэлевізора і мікрафона з вольтметрам. Тав. Музычэнка пабудаваў у арцелі, дзе ён працуе, радыёвузел і кіруе там гуртком.

ІОФЕ.

СВЯТА НА ФАБРЫЦЫ „КАСТРЫЧНІК"

Над будынкам менскай швейнай фабрыкі «Кастрычнік» запаліліся чырвоныя зоркі. Ля ўваходу на карце загарэліся сінія лямпачкі, якія ўказваюць маршрут пераходу Менск — Масква ў процігазах і процііпрытных касцюмах. Фабрычны корпус упрыгожан партрэтамі правадыроў. Праз усю тэрыторыю фабрыкі да сталовай густая алея з елак, на якіх працягнулася гірлянда электраагнёў.

На фабрыцы вялікая ўрачыстасць. З Масквы вярнуліся ўзнагароджаныя ордэнамі «Знак почета» і граматамі ўрада СССР удзельнікі выдатнага пераходу ў процігазах і процііпрытных касцюмах па маршруту Менск — Масква. На вечары-сустрэчы рабочых фабрыкі з ордэнаноснамі, які адбыўся 1 чэрвеня, прысутнічалі сакратар Менскага гаркома КП(б)Б тав. **Рыскін,** сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Аўгустайціс,** сакратар Кагановіцкага райкома КП(б)Б тав. **Варончанка,** тт. **Готфрыд, Балцін, Гваргадзе** і прадстаўнікі прадпрыемстваў Менска.

Вечар адкрыў сакратар парткома фабрыкі тав. Канопік, які пад дружныя апладысменты вітае ўзнагароджаных і прадастаўляе слова начальніку пераходу — ордэнаноснцу тав. Серабранскаму. Тав. Серабранскі запаўніў, што ў адказ на высокую ўзнагароду ўвесь калектыў фабрыкі будзе працаваць над тым, каб ператварыць прадпрыемства ў непрыступную крэпасць абароны. За ім выступіла ўдзельніца пераходу тав. Кісялёва, якая расказала аб радасных днях прабывання ў Маскве ў час атрымання высокай узнагароды.

Ордэнаноснцаў і ўзнагароджаных граматамі віталі тт. Рыскін, Готфрыд, Аўгустайціс і ад імя калектыва фабрыкі т. Марошык.

ПРЭМІІ ЗА ЛЕПШЫЯ НАВУКОВЫЯ ПРАЦЫ

Падагулены канчатковыя вынікі конкурсу на лепшую навуковую работу за 1935 г., які быў абвешчан Акадэміяй навук БССР. На конкурс былі прадстаўлены 20 работ па пытаннях гісторыі, эканомікі, медыцыны, літаратуры, хіміі, біялогіі, аграглебазнаўства. Адну з першых прэмій у 5.000 руб. атрымаў акадэмік Шчарбакоў за «Нарысы па гісторыі Беларусі». 2-ю частку. Прэмію ў 3.000 руб. атрымалі праф. Шпенпэр і інжынер Кірпічнікаў за работу «Праблема Прапойскага энерга-хімічнага камбіната», праф. Дарожкін — «Вынікі сямігадовага вывучання парашыстай паршы бульбы» і інш.

3.800 ЦЭНТНЕРАЎ ТАВАРНАГА КАРПА

У БССР праведзена работа па засяленню прудоў і азёр карпам-галавіком у колькасці 1.150 тыс. штук. У бягучым годзе ўпершыню зроблена ўгнаенне вырастных прудоў суперфасфатам і нефелінавым канцэнтратам, што павінна даць павелічэнне выхаду карпа на 30 проц. У рыбгасе «Волма» на тэрыторыі ў 8 гектараў упершыню праводзіцца падкормка карпа лубінам. З мерапрыемстваў па інтэнсіфікацыі рыбнай гаспадаркі трэба адзначыць акліматызацыю сулака і аднаўленне рыбных запасаў у 23 азёрах шляхам штучнага апладатварання ікры ляшча. У бягучым годзе рыбныя гаспадаркі здадуць 3.800 цэнтнераў таварнага карпа.

АВІЯХІМІЧНАЯ БАРАЦЬБА СА ШОДНІКАМІ ЛЯСОЎ

22—28 мая ў лясах траста Лесбел на ўчастках Глускага леспрамгаса была праведзена хімічная барацьба са шкоднікамі лясоў шляхам апылвання іх ядам з самалёта. Праведзена апыльванне 700 га лесу ядам арсенітам кальцыя. Рэзультаты хімічнай барацьбы са шкоднікамі здавальняючыя. Работа праводзілася пад кіраўніцтвам старшага навукоўвага работніка Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі тав. **Рыўніна.**

МЕЛКАВОДДЗЕ НА РЭКАХ

На рэках БССР назіраецца небывалае за апошнія некалькі год мелкаводдзе. Сярэдні сплаўны гарызонт вады знізіўся на 0.3 метра. На рэках Друць, Сож, Лучоса, Бесядзь і інш. ёсць выпалкі астаноўкі драўніны на перакатах. Лесбел накіраваў на сплаўныя пункты 20 інжынераў і гідратэхнікаў для тэрміновай пабудовы дробных гідрапабудоў і планіп з мэтаю ўзняцця ўзроўню вады і пропуску сплаўнога лесу да лесазаводаў.

СКВАЗНАЯ БРЫГАДА НА ЗАВОДЗЕ «БОЛЬШЭВІК»

У першым хромавым цэху скурзавода «Большэвік» арганізавана сквазная стаханаўская брыгада, у склад якой увахоўваць строгалі, мяздрыльшчыкі, цвайльшчыкі і пастобныя рабочыя. Брыгада яднае 33 чал.

М. Р.

КНІГА БАРБЮСА «СТАЛІН» НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Дзяржаўнае выдавецтва БССР пераклала на беларускую мову кнігу Анры Барбюса «Сталін». Гэтымі днямі кніга выйдзе ў друк. Яна выйдзе тыражом ў 30.000 экземпляраў. Апрача таго кніга будзе выдана на рускай мове.

ТЭЛЕФОННАЯ МАГІСТРАЛЬ МАСКВА—МЕНСК—НЬЮ-ІОРК

На тэрыторыі БССР закончана падвестка ліній новай міжнароднай тэлефоннай магістралі Масква—Менск — Нью-Ёрк. На мясцовай міжгародняй тэлефоннай станцыі ўстаноўлена магутная ўзмацняльная апаратура. Спецыяльная камісія наркамата сувязі Саюза прыняла будаўнічыя мантажныя работы, прызнаўшы іх зусім здавальняючымі.

НА ГАЗЕТНЫЯ ТЭМЫ

АБ КАРЫСЦІ ГРАМАТНАСЦІ

Граматнасць — абавязковая рэч для кожнай газеты, у тым ліку і для раённай. Аднак гэта даволі простая і зразумелая ісціна не засвоена ўсімі рэдактарамі.

Гэтымі днямі ў капаткевіцкай раённай газеце з'явілася заметка пад загалоўкам: «Фуліганы атрымалі па заслугах». Спачатку можна было меркаваць, што ў слова «хуліганы» укралася, як кажуць, памылка. Але і ў тэксце аказаліся «шайка фуліганаў», «займаліся фуліганствам».

За гэтай газетай па той-жа дарожны бадзёра крочыць мсціслаўская газета. У ёй антысеміты ператварыліся ў «антысімітаў».

Варта ўсё-ж такі навучыцца грамаце і работнікам раённых газет.

«ПРЫ ВЯЛІКАЙ ХУТКАСЦІ»...

Жлобінская чыгуначная газета змясціла такую заметку:

«Работнік райфінаддзела тав. Галайка паведамляе, што 13 мая ён катаўся на стадыёне на веласіпедзе. Пры вялікай хуткасці да яго, без усякага папярэджання, падбег член «Локаматыва» Грахоўскі і выхапіў з рук рупь. У рэзультаце Галайка ўпаў, скалечыўшы сабе калены, і паламаў веласіпед».

Цікава ведаць, хто з двух ехаў, а хто падбягаў «пры вялікай хуткасці»? Па-другое, прычым тут папярэджанне? Няўжо Галайка было-б лепш ад таго, што ён упаў-бы пасля папярэджання? Нельга пісаць такой «заумнай», канцэлярска-бюракратычнай мовай.

Для медыцынскага абслугоўвання калгаснікаў у час палявых работ Заходне-Сібірскі крайком РОКК арганізаваў спецыяльныя брыгады медыцынскіх работнікаў. У Чарапанаўскім зернасоўгасе брыгада арганізавала тры пункты хуткай дапамогі. Апрача таго, медработнікі выязджаюць на палявыя станы. НА ЗДЫМКУ: кіраўнік брыгады ўрач т. Каўрова на палявым стане накладвае перавязку барановальшчыку тав. Зайцаву.
Фота МЯСНІКОВА (Саюзфота).

СУД

УТРЫМАЛЬНІЦЫ ПАДПОЛЬНАГА АБАРТАРЫЯ*)

На лаве падсудных дзве сястры Зварыка. Мелання Зварыка вербавала «пацыентак». Яна вышукваля цяжарных жанчын і ўгаворвала іх рабіць аборт, гарантуючы ім поўную бяспеку. Аборты рабіла яе сястра Надзежда Зварыка на кватэры Меланні, або на кватэры даверлівай несвядомай жанчыны.

Пасля такой «аперацыі» ў жанчын пачыналася кровацячэнне і толькі кваліфікаваныя ўрачы выратоўвалі жанчын, ад смерці. Сёстры рабілі аборты нават жанчынам з 4-месячнай цяжарнасцю.

Перад судом прайшлі афяры агідных злачынцаў. Суду ўдалося ўстанавіць 6 выпадкаў абортаў. Што-ж за жанчыны, якія далі сябе калечыць? У лепшым выпадку гэта жанчыны, чыё сямейнае жыццё склалася дрэнна, якія не былі ўпэўнены ў добрых адносінах да іх сваіх мужоў. Аднак сярод афэр Зварыка ёсць і лёгкадумныя, бесturботныя жанчыны, якіх на аборт не штурхалі ніякія сямейныя ці іншыя абставіны.

Абедзве сёстры займаліся распустай. Мелання Зварыка хворая венерычнай хваробай.

Народны суд 2 участка гор. Менска два дні (1 і 2 чэрвеня) разбіраў гэту справу.

На судзе грамадскім абвінаваўнам выступіў праф. Выдрын. У зале суда, дзе адбываўся працэс, прысутнічала вялікая колькасць людзей.

Народны суд прыгаварыў Надзежду Зварыка да 5 год, а Меланню Зварыка — да 4-х год пазбаўлення волі.

*) Гл. «Звязду» ад 20 красавіка.

ПАВЕДАМЛЕННІ

— 4 чэрвеня, у 7 гадзін вечара, у Доме партактыва (вялікая зала) адбудзецца для партыйнага і комсамольскага актыва г. Менска даклад народнага артыста рэспублікі тав. В. Э. Мейерхольда на тэму: «Творчы шлях і перспектывы развіцця ішага тэатра».

На сход запрашаюцца работнікі мастацтва, літаратуры і настаўнікі г. Менска.

Білеты — у горрайкомах КП(б)Б.

— 4 чэрвеня, у 10 гадзін раніцы, у Доме партактыва адбудзецца семінар прапагандыстаў па гісторыі партыі і загадчыкаў партгабінетаў.

Адказны рэдактар Н. СТЭРНІН.

Памяшканне Белдзяржтэатра | Гастролі дзяржаўнага тэатра імя МЕЙЕРХОЛЬДА

З чэрвеня
А. Сухава-Кабылі
„СВАДЬБА КРЕЧИНСКОГО".
Пачатак у 8 г. вечара.
Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12 да 2 і з 5 да 8 г. вечара. Хто спозніцца, у глядзельную залу дапушчан не будзе.

«Чырвоная горка» — Я ВЯРНУСЯ
«Пралетарый» — ЦЫРК
«Інтэрнацыянал» — КАНДУІТ
Дзіцячы гукавы кінотэатр — КАНДУІТ
«Спартак» — 2-я серыя МІС.МЕНД

Памяшканне БДТ-1
Ад 11 чэрвеня — гастролі Харкаўскага украінскага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Т. Г. ШЭЎЧЭНКА (б. «Берэзіль»)
РЭПЕРТУАР:
А. КАРНІЙЧУК — Гибель эскадры
А. КАРНІЙЧУК — Платон Кречет.
М. ГОРКІ — Васса Железнова
А. АФІНАГЕНАЎ — Портрет
КАРПЕНКА—КАРЫЙ — Мартын Боруля
Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12 да 2 і з 5 да 8 г. веч. і ў Доме Ўрада (I паверх, левае крыло).
ДЫРЭКЦЫЯ БДТ-1.

Прадаўжаецца ПАДПІСКА на 2-е паўгоддзе 1936 г.
на ЖУРНАЛ
ИЗОГИЗ КОГИЗ
„ТВОРЧЕСТВО"
Орган Маскоўскага абласнога саюза совецкіх мастакоў.
12 нумароў у год.
Журнал знаёміць чытачоў з найбольш значнымі работамі мастакоў СССР у жывапісе, графіцы, скульптуры, дэкаратыўным мастацтве і з матэрыяламі бягучых мастацкіх выстаўак і з навінамі сучаснага выяўленчага мастацтва за рубяжом.
Журнал разлічан на масавага чытача, які цікавіцца выяўленчым мастацтвам, а таксама на мастакоў.
Падпісная цана: на 6 мес.—16 руб. 50 кап. на 3 мес.— 8 руб. 25 кап.
Цана асобнага нумара—2 р. 75 кап.
ПАДПІСКА прымаецца ўсімі аддзяленнямі, магазінамі, кіёскамі, упаўнаважанымі КОГІЗ'а, Саюздрукам, усюды на пошце, а таксама ў галоўнай канторы КОГІЗ'а — Масква, Марасейка, 7.

Беларускі дзяржаўны прававы інстытут пры НКЮ БССР,
які рыхтуе следчых, суддзяў, пракуроў, адказных работнікаў цэнтральнага апарата НКЮ і прававых работнікаў ведамстваў і гаспадарчых органаў,
АБВЯШЧАЕ АСЕННІ НАБОР студэнтаў
на судова-пракурорскі і гаспадарча-прававы факультэт з адрывам ад вытворчасці.
У інстытут прымаюцца асобы, якія дасягнулі 18-гадовага ўзросту, і не старэй 35 год.
Паступаючы ў інстытут павінен мець падрыхтоўку ў аб'ёме сярэдняй школы.
Незалежна ад асветы паступаючыя ў інстытут павінны здаць іспыты за сярэднюю школу па беларускай і рускай мовах, матэматыцы і грама. дазнаўству.
Тэрмін вучобы — 4 гады.
Усе студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй — ад 98 да 200 руб. у месяц.
Прыём заяў для паступлення ў інстытут з 1 чэрвеня да 15 жніўня 1936 г.
Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: анкета для паступаючага ў ВНУ, засведчаная адпаведнай арганізацыяй, пасведчанне аб асвеце, даведка аб стане здароўя, копія вайсковага білета (для мужчын) і 2 фотакарткі.
Іспыты будуць праводзіцца з 15 да 25 жніўня г. г.
Пачатак заняткаў — 1 верасня.
Заявы надаваць на імя дырэктара інстытута на адрасу: г. Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой 35.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Палітаддзел соўгаса «Пачаевічы» з глыбокім жалем паведамляе аб заўчаснай смерці памочніка начальніка палітаддзела МАЙСЕЯ ГІРШЗВІЧА ЭПШТЭЙНА

Изд-во «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» — Москва, 6, Пушкинская пл. —
ПРИНИМАЕТСЯ ПОДПИСКА на 2-е полугодие (июль-декабрь) 1936 г. на ежемесячный литературно-художеств. и общественно-политич. журнал
НОВЫЙ МИР
(XII год издания).
Во втором полугодии в «Новом мире» будут напечатаны:
РОМАНЫ:
М. Шолохов — Поднятая целина, кн. 2-я.
А. Малышкин — Тридцатые годы.
Вс. Иванов — Похождения факира, части 4-я и 5-я.
В. Зазубрин — Горы, кн. 2-я и 3-я.
Ал. Карцев — Магистраль, кн. 2-я.
Бруно Ясенский — Новый роман.
А. Новиков-Прибой — Два друга.
Г. Никифоров — Мастера, часть 2-я.
ПОВЕСТИ И РАССКАЗЫ:
Вс. Иванова, Л. Леонова, Мариэтты Шагинян, И. Бабеля, Бор. Пильняка, Л. Никулина, И. Шухова, И. Огнева, В. Лидина, К. Горбунова, М. Козакова, К. Паустовского, Н. Никитина, И. Соколова-Микитова, М. Чумандрина, Ал. Яковлева, А. Чапыгина, А. Перегудова, М. Слонимского, И. Катаева, Н. Зарудина, П. Низового, А. Гарри, И. Евдокимова, Н. Ихова, Л. Овалова и др.
ПОЭМЫ и СТИХИ. ПЬЕСЫ.
СТАТЬИ И ОЧЕРКИ.
УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ:

Без переплета:			В переплете:		
6 м.	3 м.	1 м.	6 м.	3 м.	1 м.
18 р.	9 р.	3 р.	27 р.	13 р.50	4 р. 50

ПОДПИСКА ПРИНИМАЕТСЯ: Главной конторой изд-ва «Известия ЦИК СССР и ВЦИК» — Москва, 6, Пушкинская пл., повсеместно почтой, сборщиками подписки на предприятиях и на транспорте.

ДАСТАЎКА ХЛЕБАБУЛАЧНЫХ ВЫРАБАЎ на ДОМ
У мэтах лепшага абслугоўвання пакупнікоў наступныя магазіны хлебнай канторы Менгорхарчгандля ПРЫМАЮЦЬ ЗАКАЗЫ
на дастаўку хлебабулачных вырабаў на ДОМ:
магазін № 102 — Суражская, 2, тэл. 25.667;
» № 108 — пер Совецкай і Свярдлоўскай, тэл. 23.046;
» № 109 — Совецкая, супроць Дома ўрада, тэл. 23.968;
» № 129 — 1-я Лекарта, 12, тэл. 23.750;
» № 131 — Ленінская, 42, тэл. 22.472;
» № 132 — Ленінская, 16, тэл. 24.996;
» № 133 — Ленінская, 5, тэл. № 23.861;
» № 135 — Інтэрнацыянальная, 7;
» № 139 — Няміга, 21;
» № 140 — Пер Комсамольскай і Рэвалюцыйнай, тэл. 23.853;
» № 143 — Пер Энгельса і Совецкай;
» № 165 — Ленінская, № 22, тэл. 25.967;

Прыём заказаў на дастаўку хлеба на дом праводзіцца ў любы час.
ДЫРЭКЦЫЯ ХЛЕБНАЙ КАНТОРЫ МЕНГОРХАРЧГАНДЛЯ.

Даводзіцца да ведама фабзаўмясцкомаў і камсодаў
прадпрыемстваў і ўстаноў гор Менска, што 5 чэрвеня г. г.
апошні тэрмін перарэгістрацыі камсодаў.
Тыя камсоды, якія не дашлюць вестак аб складзе камсодаў па ўстаноўленай форме горкамсода
пасля ўказанага тэрміну будуць пазбаўлены магчымасці быць абслугоўваемымі горкамсодам і ашчадкасай.
Анкеты для перарэгістрацыі траба атрымаць у горкамсодзе (Карла Маркса, 16, пакой 22).

СМІЛАВІЦКІ ПАЛЯВОДЧЫ ТЭХНІКУМ,
які рыхтуе аграномаў-паляводаў,
АБВЯШЧАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ на першы курс.
Тэрмін навучання — 4 гады 12 месяцаў.
У тэхнікум прымаюцца асобы на ўзросце ад 16 да 30 год, якія маюць падрыхтоўку не ніжэй НСШ (сямігодкі).
Прыём заяў да 10 жніўня.
Да заявы павінны быць прыкладзены:
1) кароткая аўтабіяграфія паступаючага;
2) пасведчанне аб скончанні НСШ (абавязкова ў арыгінале);
3) даведка аб здароўі ад дзяржаўнай лекавай установы;
4) метрыка;
5) дзве фотакарткі з уласнаручным подпісам і завераныя дзяржаўнай установай;
6) паштовых марак на 40 кап.
Пры асабістай яўцы з дакументамі ці на прыёмныя іспыты паступаючы павінен мець пры сабе пашпарт.
Усе паступаючыя з 15 па 25 жніўня трымаюць праверачныя іспыты ў аб'ёме НСШ па матэматыцы, фізіцы, беларускай мове і літаратуры, фізічнай геаграфіі і палітграмаце.
Студэнты забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй па паспяховасці.
Заявы накіроўваць па адрасу: п/а Смілавічы, БССР, паляводчаму тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ВЫД-ВА „МОЛАДАЯ ГВАРДЫЯ" КОГИЗ
ПРАДАЎЖАЕЦЦА ПАДПІСКА на другое паўгоддзе 1936 г.
на літаратурна-мастацкі і культурна-палітычны двухтыднёвік ЦК ВЛКСМ
„МОЛОДОЙ КОЛХОЗНИК"
«Молодой колхозник» — адзіны масавы журнал ЦК комсамола для вясковай моладзі. Ён дапамагае выхаванню з моладзі культурных і непрымірымых барацьбітоў за справу Леніна—Сталіна.
Журнал знаёміць чытача з лепшымі ўзорамі творчасці совецкіх пісьменнікаў.
Друкуе апавяданні герояў рэволюцыі аб выхаванні сілы волі, мужнасці, бясстрашнасці.
У журнале друкуюцца нарысы і фельетоны на вострыя, хвалюючыя вясковую моладзь тэмы.
«Молодой колхозник» багата ілюстраваны.
Падпісная цана: на тры месяцы—3 руб.
Асобны нумар каштуе 50 кап.
Падпіска прымаецца ўсімі аддзяленнямі, кіёскамі, магазінамі, упаўнаважанымі КОГІЗ'а, а таксама непасрэдна ў Галоўнай канторы КОГІЗ'а (Масква, Марасейка, 7) і ўсюды на пошце.

Беларускі дзяржаўны вышэйшы педагагічны інстытут
абвяшчае ПРЫЁМ
на 1936—37 навучальны год на 1 курс наступных факультэтаў:
1) гістарычнага, 2) геаграфічнага, 3) літаратуры і мовы, 4) педагагічнага з аддзяленнямі: педагагічным і дашкольным, 5) замежных моў (нямецкае аддзяленне) і на яўрэйскую секцыю літаратурнага і гістарычнага фа. культэтаў.
Інстытут рыхтуе выкладчыкаў для сярэдняй школы, тэхнікумаў і рабфакаў.
У інстытут прымаюцца асобы не маладзей 17 гадоў і не звыш 35. Усе асобы, якія паступаюць у ВНЗ, павінны мець закончаную сярэднюю асвету (сярэдняя школа, тэхнікум, рабфак) ці атэстат аб скончанні сярэдняй школы ў парадку экстэрната.
Незалежна ад мэтачайся асветы паступаючыя павінны трымаць іспыты ў аб'ёме курсу сярэдняй школы па беларускай і рускай мовах і літаратуры, матэматыцы, фізіцы, хіміі і палітграмаце. Паступаючыя на геаграфічны факультэт трымаюць іспыты па геаграфіі. Паступаючыя на яўрэйскую секцыю трымаюць іспыты па яўрэйскай і рускай мовах.
УВАГА. Скончыўшыя дзесяцігодку з адзнакай па асноўных дысцыплінах «выдатна», а па астатніх—маляванне, чарчэнне, спевы, музыка, фізкультура — не ніжэй «добра», залічваюцца без іспытаў. Асобы, якія скончылі сярэднюю школу не ў БССР і атрымалі нездавальняючую ацэнку па бел. мове і літаратуры, могуць быць залічаны ў лік студэнтаў пры ўмове паспяховай здачы імі іспытаў па астатніх прадметах з абавязкам здаць іспыты па беларускай мове і літаратуры ў пачатку наступнага навучальнага года.
Заявы падаваць на імя дырэктара ВНІ з прыкладаннем наступных дакументаў:
атэстата аб скончанні сярэдняй навучальнай установы (рабфака, тэхнікума) у арыгінале;
аўтабіяграфіі;
пасведчання дзяржаўнай лекавай установы аб тым, што стан здароўя паступаючага не перашкаджае паступленню ў ВНУ;
двух фатаграфічных картак з уласнаручным подпісам на кожнай з іх, заверанага дзяржаўнай установай.
Пашпарт пры прыездзе прадстаўляецца асабіста.
УВАГА. 1. У аўтабіяграфіі пас тупаючы павінен паведаміць аб сабе наступныя весткі: год і месца нараджэння, нацыянальнасць, грамадзянства, партыйнасць, прыналежнасць да ВЛКСМ, адукацыя, прафесія, спецыяльнасць, выніковы стаж, сямейнае становішча, сацыяльнае становішча бацькоў, да-ныя аб заработку і адносінах да вайсковай павіннасці.
2. У заяве трэба ўказаць які факультэт і спецыяльнасць паступаючы выбірае.
3. У заяве павінен быць указан дакладны адрас паступаючага.
Прыём заяў аб залічэнні праводзіцца з 1 чэрвеня па 1 жніўня. Прыём іспытаў адбудзецца з 10 па 20 жніўня; залічэнне ў склад студэнтаў — з 20 па 25 жніўня.
Іншагародніх студэнты забяспечваюцца інтэрнатам. Стыпендыя — у залежнасці ад паспяховасці.
Членам сям'і студэнтаў інтэрнат не прадастаўляецца.
Заявы падаваць па адрасу: г. Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, канцылярыя ВНІ, пакой № 2.36.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Тыраж 90550 экз. Друкарня газеты «Звязда», Менск, Совецкая, 83. Уп. Галоўлітбела № К—98.